Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ЮРКА „0-85" АСЕННІК ☞ 12

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 5 (2594) Год LI Беласток, 29 студзеня 2006 г. Цана 2,00 зл.

Падобныя маніфестацыі 16 студзеня, у „Дзень салідарнасці з Беларуссю", былі сарганізаваны ў некалькіх гарадах Польшчы, м.інш. у Варшаве, Познані і Вроцлаве...

Салідарнасць з Беларуссю

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Маніфестацыя салідарнасці з Беларуссю пад беластоцкай Ратушай

„Так для свабоды", „Хочам свабоды ў Беларусі", „Свабода слова ў Беларусі" — такія, між іншым, транспаранты відаць было ў час маніфестацыі „Дзень салідарнасці з Беларуссю", сарганізаванай пад беластоцкай Ратушай фондам імя Роберта Шумана. Над тлумам сабраных пару дзесяткаў перш за ўсё маладых людзей луналі два сцягі: бел-чырвоны і бел-чырвона-белы. Сабраныя скандзіравалі: „Лукашэнка — узурпатар", „Жыве Беларусь!". Некалькі маладых людзей з зачыненага адміністрацыяй Аляксандра Лукашэнкі і дзейнічаючага ў падполлі Беларускага ліцэя ў Мінску, пад акампанемент гітары, спявалі беларускія песні. З гукаўзмацняльнікаў далятали беларускія песні, пратэст-сонгі, такія як „Ты не чакай". Выпушчаны былі каляровыя шары, разам з якімі, як гаварылі арганізатары маніфестацыі, паляцеў на Беларусь дых свабоды, хоць у сапраўднасці вецер панёс іх у бок Ломжы і Варшавы. Удзельнікаў акцыі прывітаў Павел, вучань мінскага гуманітарнага ліцэя імя Я. Коласа.

Прывітаны воплескамі старшыня Фонду імя Роберта Шумана Пётр Навіна-Канопка гаварыў:

— Салідарнасць гэта слова, якое палякам памагло зламаць блізка 50-гадовую савецкую дамінацыю, гэта слова, якое вызваліла палякаў, дазволіла ажыццявіць мары шмат пакаленняў, якія без гэтага не маглі б здабыцца на незалежнасць. Сёння, калі Польшча з'яўляецца свабоднай краінай, у яе ёсць свае праблемы, але сама яна вырашае аб сваім лёсе, грамадзяне галасуюць на свабодных і дэмакратычных выбарах, дык гэта слова мусіць з нашага боку прагучаць у той бок, туды, дзе ляжыць Беларусь, туды, дзе нашы суседзі і пабрацімы, туды, дзе жывуць людзі такія як і мы, пераносячыя лад, які не з'яўляецца дэмакратычным, пакутуючы не толькі ад бяды, але і ад зняволення.

Фота ВІТАЛЯ ВОРАНАВА

Памяць аб зніклых ушаноўвалася ў Познані

Дырэктар беларускага Гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа Уладзімір Колас адзначыў, тлумачыўшы, чаму такая важная салідарнасць у Беларусі:

— Калі я ў Беластоку, заўсёды мне дыхаецца лёгка, я адчуваю сябе лепш чым у Мінску. Мы не можам так, як вы тут, сабрацца, сказаць тое, што хочам, бо гэта небяспечна. Кожная таталітарная ўлада хоча як найдаўжэй вісець на шыі народа. Ян Павел II сказаў палякам, будучы ў Польшчы: „Не лякайцеся!" Мы пакуль што расцярушаныя, небяспечна збірацца, але для нас вельмі важнае, каб адчуваць, што мы не адны і таму такія дні салідарнасці для нас вельмі важныя, і за гэта вам дзякуем.

На спецыяльна развешаным на муры Ратушы экране былі пушчаны фільмы-кліпы, якія датычылі парушэнняў асабістых і грамадзянскіх правоў у Беларусі, сярод іх прысвечаны закрыццю Гуманітарнага ліцэя. Падобныя маніфестацыі 16 студзеня, у „Дзень салідарнасці з Беларуссю", былі сарганізаваны ў некалькіх гарадах Польшчы, м.інш. у Варшаве, Познані і Вроцлаве. Праводзіліся яны дзень пасля таго, як дзяржаўнае беларускае тэлебачанне пусціла чарговы фільм, які крытычна адносіцца да Польшчы ды ў час падрыхтовак да адпраўлення на сакавіцкія прэзідэнцкія выбары ў Беларусь шматлікай групы польскіх наглядальнікаў, на што сродкі гарантаваў польскі ўрад.

Раіна Стэфанчук

Выбары 2006 ☞ 2

Уладзімір Хільмановіч

Маніторынг па зборы подпісаў не адлюстроўвае таго, як будуць галасаваць людзі. Бо адны не хацелі б падпісвацца за вечнага прэзідэнта, але іх прымусілі, іншыя ж хацелі падпісацца за кагонебудзь альтэрнатыўнага, але пабаяліся. Да некаторых зборшчыкі не дайшлі. Так што з вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што за шторамі выбарчых кабінаў усе гэтыя плыні нарэшце рэалізуюць свае інстынкты...

Працэс 11-ці ☞ 2

Мацей Халадоўскі

Чатыры заявы аб адтэрміноўцы паўплывалі на тое, што працэс супраць адзінаццаці асоб звязаных з Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва" адтэрмінаваны на тры тыдні — на 14 лютага, значыць, да Валянцінак. Першы вызначаны разгляд у III Крымінальным аддзеле беластоцкага Раённага суда працягваўся няпоўных дзесяць хвілін. Згодна плану на разгляд справы пры першым падыходзе прызначаны былі чатыры гадзіны...

Чыгунка ☞ 5

Аляксандр Вярбіцкі

Новы расклад паяздоў, што паявіўся ў снежні, вярнуў ранішні цягнік з Беластока ў бок Седльцаў. Цяперашні рэйкавы аўтобус пакідае Беласток на гадзіну пазней, чым ягоны колішні папярэднік, а гэта дазваляе без спешкі адправіцца ў падарожжа па Падляшшы ў камерных абставінах выгаднага вагончыка-салончыка. Ёсць тут толькі адна нявыгада...

Гісторыя і мы ☞ I

Алесь Чобат

У рускай гістарыяграфіі Лістападаўскае паўстанне 1830 года вядомае як „польская вайна 1831 года", што трэба разумець... як польская агрэсія супраць Расіі — у польскім разуменні першай паловы XIX ст. Польшча была тым самым, чым Рэч Паспалітая ў межах 1772 года, а Расія была zaborcą, але ў рускім разуменні Польшча была тым, чым Каралеўства Польскае ў межах 1815 года...

Спадарыні
АЛЕНЕ МАКОЎСКАЙ,
старшыні Рады Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына",
словы шчырага спачування
з прычыны напаткаўшага Яе гора
— смерці бацькі —
выказваюць беларусы Беласточчыны.

Кожны выбірае па сабе

Кожны выбірае па сабе — спяваецца так у некалі вельмі папулярнай бардаўскай песні. Збор подпісаў за людзей, якія хочуць стаць прэзідэнтам Беларусі і чалавека, які хоча ім заставацца пажыццёва, не сказаць каб скалануў айчыннае грамадскае балота, але прынамсі дае значны розгалас. Ад размоваў з людзьмі на вуліцах, на лесвічных пляцоўках і за дзвярыма кватэр, слухання іншых, публічных выказванняў вядомых асоб, уражанне па адным пытанні ў мяне асабіста адназначнае. Усе, ледзь не на сто адсоткаў, ужо вызначыліся ў дачыненні да асобы Аляксандра Лукашэнкі, рэйтынг ведамасці якога абсалютны. Адны зацята супраць яго, іншыя, яшчэ больш катэгарычна (часам фанатычна) — за. Гэтыя дзве плыні намнога большыя, чым трэцяя катэгорыя — людзі без асаблівых палітычных перакананняў. Людзі з гэтай самай „лагоднай" групы таксама ведаюць, як будуць галасаваць. Адны за Рыгоравіча, таму што, „які б ён не быў, іншага ці лепшага няма". Іншыя абавязкова супраць, „хоць бы за каго, бо гэты ўжо абрыднуў". Такім чынам паўстае пытанне на каго палююць „збіральнікі скальпаў"? Паводле выбарчых тэхналагічных вучэнняў менавіта за галасы гэтай трэцяй і „хісткай" катэгорыі трэба весці змаганне заангажаваным камандам прэтэндэнтаў. Але пераканаць нашага чалавека надзвычай цяжка. Таму збор подпісаў, акрамя як юрыдычная непазбежнасць, мае найперш значэнне інфармавання як пра сам факт выбараў прэзідэнта, так і пра кандыдатаў. Хоць з апошнім не асабліва разгонішся — кожная інфармацыя можа быць расцэнена як агітацыя. Так ініцыятыўныя групы Зянона Пазьняка і Аляксандра Мілінкевіча ўжо атрымалі афіцыйныя папярэджанні ад Цэнтрвыбаркама. Адначасна рызыкну змеркаваць, што рэальная выбарчая актыўнасць у сакавіцкай кампаніі будзе надзвычай высокай, бо з аднаго боку будзе масавы „загон", з іншага ўзросшы імпэт людзей.

Наступная агульная выснова — маніторынг па зборы подпісаў не адлюстроўвае таго, як будуць галасаваць людзі. Бо адны не хацелі б падпісвацца за вечнага прэзідэнта, але іх прымусілі, іншыя ж хацелі падпісацца за каго-небудзь альтэрнатыўнага, але пабаяліся. Да некаторых зборшчыкі не дайшлі. Так што з вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што за шторамі выбарчых кабінаў усе гэтыя плыні нарэшце рэалізуюць свае інстынкты. Але на гэты раз большасць не цікавіць, як прагаласуюць людзі. Агульная думка — лёс кампаніі можа вызначыць толькі „майдан".

Стратэгія ж дэмакратычнай апазіцыі (ці, калі хочаце, так званай апазіцыі, а каму заўгодна, псеўдаапазіцыі) даволі супярэчлівая і занадта складаная для звычайнага сярэдняга выбаршчыка. У дачыненні да самой працэдуры галасавання ёсць ужо тры выразныя падыходы. Пералічым іх (паслядоўнасць падавання значэння не мае).

Варыянт першы. Ігнараваць выбарчую кампанію з гледзішча таго, што адбываюцца псеўдавыбары з загадзя вядомым падлікам. Іншымі словамі, байкатаваць незаконныя выбары і папросту не ісці на ўчасткі. За гэта выступілі такія вядомыя асобы як Васіль Лявонаў, Андрэй Клімаў, Уладзімір Парфяновіч, Уладзімір Колас.

Варыянт другі. Браць удзел ва ўсіх этапах выбарчай кампаніі. Ісці і галасаваць за свайго кандыдата. Гэтай тактыкі трымаюцца штабы Аляксандра Мілінкевіча, Аляксандра Казуліна і Валерыя Фралова. Кампанію апошняга сур'ёзнай лічыць не варта. Што ж датычыць Сяргея Скрабца, то яго ўдзел мае на мэце прыцягненне ўвагі да свайго лёсу і цалкам апраўдальны, зважаючы на крымінальную справу, якая ідзе супраць гэтага прадпрымальніка і палітыка.

Варыянт трэці. Народнае галасаванне, якое прапануе Зянон Пазьняк і беларускі вызвольны рух. Прапаноўваецца таксама ісці ў дзень галасавання на выбарчыя ўчасткі з загадзя выраблеными сваім бюлетэнем, у які будзе ўпісана прозвішча народнага кандыдата. Кідаць у скрынку менавіта свае бюлетэні, а незаконныя бюлетэні рэжыму забіраць з сабой, каб пазней перадаць народнай камісіі. Да трэцяга варыянта ўрэшце наблізіўся і Аляксандр Вайтовіч, які зняў сваю кандыдатуру і спыніў кампанію. Патлумачыў ён сваю пазіцыю тым, што Лукашэнка не мае права балатавацца. Крыху пазней заклікаў ісці на выбары і забіраць бюлетэні з сабой.

Яшчэ адно асабістае ўражанне — кампанія 2006 года збоку і з „сярэдзіны" выглядае значна цікавей аналагічных выбараў 2001 года. Наперадзе рэгістрацыя кандыдатаў, якая можа шмат „прасвятліць".

Уладзімір Хільмановіч

Навагодне-Калядныя святы

Святы, святы — і па святах. Ужываю тут множнага ліку, бо ў гэтую пару года іх многа — сваіх праваслаўных і каталіцкіх. І ўсе яны вялікія, важныя і абросшыя багатай народнай традыцыяй. Калісьці святкаваў я іх у вёсцы, а цяпер святкую ў горадзе. Гэтыя святы па сутнасці быццам заўсёды адны, але святкуюцца і ўспрымаюцца яны па-рознаму. Розніца залежыць ад месца святкавання, часу і ўзросту чалавека. Інакш святкуюць і ўспрымаюць святы дзеці, інакш дарослыя і старэйшыя людзі.

Найбольш востра ўспрымаюць святы, канешне, дзеці, бо найбольш і радасці прыносяць яны менавіта ім. Па-першае, могуць добра адпачыць ад надаедлівай і нуднай школы. Па-другое, гэта час на санкі, канькі, лыжы і традыцыйныя святочныя заняткі і забавы, напрыклад, падрыхтоўка гвязды і калядаванне. Па-трэцяе, вясёлая ёлачка ў хаце і падарункі ад святога Мікалая. Па-чацвёртае, багатыя і смакавітыя святочныя стравы. Якуб Колас пісаў: „А для дзяцей найбольша свята абы наесціся багата". І хоць наступілі тут немалыя змены, бо быццам цяпер дзеці не галадаюць, але ўсё ж такі смачней паесці ўсе любяць. Да таго ж нарэшце ўся сям'я, а часам і госці, дома. Вось таму з такой радасцю чакаюць дзеці свят...

З падобных прычын мілыя святы і для сярэдняга пакалення, бо і яны чакаюць адпачынку ад навукі ці працы, скарыстання з зімовых спортаў і забаў, а і святочнага стала і падарункаў...

Найменш цешацца са свят старэйшыя людзі, бо святы ўносяць многа мітусні ў спакойнае штодзённае жыццё. А старэйшыя людзі патрабуюць спакою і цішыні. Адпачынку ім і так хапае...

Найбольшыя аднак змены ў святкаваннях і падыходзе да свят наступілі і наступаюць пад уплывам часу. Традыцыйная духоўнасць замяняецца, так бы мовіць, свецкасцю, набожнасць — традыцыяй. Моцна страцілі на сваёй абавязковасці і сіле, напрыклад, пасты. Іх у нас многа і суровыя яны, але яшчэ не так даўно іх абавязкова выконвалі. Так бывала спошчваліся, што старэйшыя людзі з цяжкасцю ўлазілі на печ. Цяпер людзі ўжо не так прытрымоўваюцца пастоў, хаця зусім проста стала замяніць скромную страву смачнай і пажыўнай поснай стравай...

А вось традыцыя калядавання трымаецца даволі добра. Відаць таму, што гэта вельмі прыгожая традыцыя. Яна нават пашырыла сваё поле дзеяння. Смела і пераканаўча заняла сваё месца не толькі пад акном, у хаце, але і на сцэне. Ужо многія гады ў нас у Гайнаўцы, напрыклад, рэгулярна адбываюцца агляды і конкурсы праваслаўных калядак і гвязд. Выступае на іх мноства розных груп і калектываў — ад дашкольнікаў да вучняў сярэдніх школ. Адным словам, амаль усе нашы школы і прадшколлі прысылаюць свае калядныя калектывы. І колькасць удзельнікаў з кожным годам расце. Калі ў прошлых гадах выступала іх дзесьці па пяцьсот чалавек, дык у гэтым годзе ўжо звыш сямісот. І проста люба-здорава паглядзець і паслухаць як нават найменшыя дзеткі з вялікім душэўным хваляваннем і святасцю цягнуць сваё „Раждаство"...

Не горш маецца і стары Новы год. Нягледзячы на свой узрост, ён не толькі добра трымаецца ў нашых вёсках, але і станоўча заіснаваў у тутэйшых гарадах. І калі калядаванне паявілася і на сцэнах, то праваслаўны Новы год загасцяваў на гарадскіх салонах — і зусім добра чуецца там. Яго ўрачыста святкуюць, пра яго пішуць, па радыё трубяць і па тэлебачанні паказваюць. А ўжо ноччу з трынаццатага на чатырнаццатае студзеня і ўвогуле заснуць не даюць. І вельмі добра: Няхай жыве і квітнее нам стары Новы год!..

Так ужо ёсць з народнымі традыцыямі: адны занікаюць, другія трымаюцца даволі добра, трэція развіваюцца і пашыраюцца.

Выразна змяняецца і псіхіка, і менталітэт нашага тутэйшага народа. Назіраючы за сёлетнімі і мінулагоднімі святамі выразна відаць, што праходзяць яны надзвычай ціхутка, спакойна, нават нейк сонна, адным словам, нетыпова. І проста сам не ведаю ці нам радавацца з гэтага, ці сумаваць. З аднаго боку быццам бы і добра, што менш п'яцца ў святы, а, значыць, і менш п'яных дэбошаў і буянства. А з другога, робіцца і сумнавата не пабачыўшы і не пачуўшы іх нават у найбольшыя гадавыя святы. Што ж гэта за святы, калі ніхто не паспяваў, ніхто не пакрычаў, не пабуяніў ды не дастаў сам ці не даў каму па мордзе. Гэта ж таксама нашы адвечныя традыцыі. А свае традыцыі аберагаць і шанаваць заўсёды трэба.

Прычыны такога стану бачу дзве. Або наш народ хоча паказацца аб'яднанай Еўропе, што і мы не лыкам шыты — і ўмеем быць заходнееўрапейцамі. Або так збяднеў ужо, што нават у найбольшыя гадавыя святы не можа напіцца ўволю. І гэта нядобра, бо такія раптоўныя змены сваіх звычак, мабыць, здароўю шкодзяць.

Хрэна варты такі Еўрасаюз, які калечыць нашу псіхіку. Калі ж гэта ад нашай беднасці, то хрэна варты мы...

Васіль Сакоўскі

Вачыма судовага наглядальніка

Працэс адзінаццаці

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Чатыры заявы аб адтэрміноўцы паўплывалі на тое, што працэс супраць адзінаццаці асоб звязаных з Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва" адтэрмінаваны на тры тыдні — на 14 лютага, значыць, да Валянцінак. Першы вызначаны разгляд у III Крымінальным аддзеле беластоцкага Раённага суда працягваўся няпоўных дзесяць хвілін. Згодна плану на разгляд справы пры першым падыходзе прызначаны былі чатыры гадзіны. Заявы на адтэрміноўку падалі ўпаўнаважаныя абвінавачаных і звязаны былі яны з прафесійнымі і прыватнымі раней вызначанымі планамі.

Разгляду чакала шматлюдная група журналістаў. У дзень, калі меўся ён пачацца, справа зноўку набрала медыяльнага розгласу. Газета „Rzeczpospolita" прыпомніла: „Пракуратура занялася выяўленымі Найвышэйшай кантрольнай палатай няправільнасцямі ў разліках датацый з Міністэрства культуры ў 2001-2002 гадах. Беларусы, аднак, заяўляюць, што закону не парушылі. — Падобна як і мы разлічаліся іншыя арганізацыі. Размеркавалі мы датацыю на цэлы год, бо не хацелі ў кастрычніку зачыняць газету, — тлумачаць абвінавачаныя і заяўляюць, што ўся справа гэта спроба запалохвання беларускіх дзеячаў у Польшчы". Газета прыгадала, што галоўным абвінавачаным з'яўляюцца прафесар Яўген М., былы шэф Праграмнай рады і бухгалтарка. „Rzeczpospolita" прытым пералічвае па прозвішчы і яго, так як і частку іншых абвінавачаных.

— Заклікаю не публікаваць воблікі і прозвішчы абвінавачаных, — зрабіў заўвагу старшыня суддзёўскага складу Кшыштаф Казлоўскі.

Журналістка газеты „Rzeczpospolita" спаслалася на словы Сакрата Яновіча:

— Я ўжо бачу загалоўкі савецкіх газет у Беларусі. Гэта выглядае так, быццам хтосьці захацеў дыскрэдытаваць гэтых беларусаў, якія думаюць па-еўрапейску і хацелі б бачыць беларусаў у Еўропе.

Пісьменнік з Крынак выказаў таксама апаску, што рэжым Аляксандра Лукашэнкі можа выкарыстаць працэс у прапагандысцкіх мэтах.

Большасць абвінавачаных адказвае за парушэнні закону аб рахункаводстве ад 29 верасня 1994 г., у якім гаворыцца: „Хто супраць правіл закону дапускаецца несастаўлення фінансавай справаздачы, састаўлення яе нязгодна з правіламі закону ці змяшчэння ў гэтай справаздачы несумленных даных падвяргаецца штрафу або зняволенню да 2 гадоў, або двум гэтым пакаранням разам".

А прафесару М. і бухгалтарцы пагражае нават да 8 гадоў зняволення. Суд раней запрапанаваў па прапанове пракурора, каб у выпадку астатняй дзевяткі, якой уступна пастаўлены былі абвінавачанні, справа была спынена, па прычыне невялікай шкоднасці. Усе яны аднак хочуць, каб справу разглянуў суд, каб высветліць свой удзел у справе да канца.

Мацей Халадоўскі

Зараз у нашай бібліятэцы знаходзіцца больш за 10 тысяч асобнікаў. Найбольш у нас мастацкай і метадычнай літаратуры для навучання беларускай мовы. Многа ёсць кніжак па гісторыі, геаграфіі і музыцы...

Стваральніца нашай бібліятэкі

Размова з Наталляй ГЕРАСІМЮК, бібліятэкаркай Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы.

— З 16 па 20 студзеня ў Беларускім музеі ладзіцца ёлка для вучняў падставовых школ. Што адметнае будзе ў гэтым годзе ў час мерапрыемства?

— Кожны год мы рыхтуем новы сцэнарый, з новымі гульнямі і конкурсамі. У гэтым годзе ёлку вядуць 12 гімназістаў. Кожная асоба адказная за конкурсы, спаборніцтвы і гульні прыпарадкаваныя да асобнага месяца. Штодзень у мерапрыемстве будзе ўдзельнічаць звыш 100 вучняў, а дэкларавала свой удзел у ёлках 700 асоб. Будуць гэта вучні ўсіх падставовых школ Гайнаўскага павета, у якіх вядзецца навучанне беларускай мовы. Уся праграма мерапрыемства вядзецца на беларускай мове і ёлка з'яўляецца своеасаблівым спосабам заахвочвання да вучобы беларускай мове.

— Раней у арганізацыю мерапрыемства ўключаліся вучні Гайнаўскага белліцэя, а апошнім часам вядуць ёлку вучні Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы. Ці многа ініцыятывы выходзіць ад моладзі?

— Ужо з верасня мінулага года ішла падрыхтоўка сцэнарыя, а вучні самі прыдумалі конкурсы. Я стараюся, каб больш ініцыятывы было з боку моладзі, назіраю за іх працай і кірую некаторымі работамі.

— Ёлка, за якую Вы адказная асабіста, арганізуецца Беларускім музеем з 1999 года. Аднак не ўсе мерапрыемствы адбываліся ў будынку музея.

— Я прыйшла на працу ў снежні 1997 года і праз год пачалі мы ладзіць ёлку. Спачатку мерапрыемства арганізавалася толькі для дзетак з Гайнаўкі. Пасля пачалі мы ездзіць па гмінах Гайнаўскага павета і там ладзілі ёлкі. Адзін год па прычыне смерці майго брата не было святочнага мерапрыемства, а апошнімі гадамі мы запрашаем вучняў на гульні ў музей.

— Дзеткі з нецярплівасцю чакаюць падарункаў. Ці ёсць спонсары, што дапамагаюць іх купіць?

— Няма ніякіх спонсараў. Дзеткі плацяць па 10 злотых і дзякуючы магазінным скідкам мы можам падрыхтаваць падарунак на суму 13-14 злотых. Вялікай выручкай стала дапамога Тамаша Ціханюка, які, прыйшоўшы на працу ў музей, стаў займацца музычным афармленнем мерапрыемства.

— У мінулым годзе чуліся нараканні, што трэба прыязджаць на ёлку ў дзень вялікага посту перад святам Хрышчэння Гасподняга.

— Няма магчымасцей арганізаваць ёлку на працягу 4 дзён для 700 вучняў, а ўжо традыцыйна ладзім яе ў апошнім тыдні перад зімовымі канікуламі.

— Зараз разам з вучнямі і настаўнікамі Гайнаўшчыны і Брэстчыны рэалізуеце вы супольны праект.

— Рэалізацыя праекта пачалася ў жніўні мінулага года ад семінара наладжанага для настаўнікаў з Гайнаўшчыны і Беларусі. Вучыліся яны збіраць фальклор, легенды, міфы і паданні з наваколля Белавежскай пушчы, па абодвух баках мяжы. У рэалізацыю праекта, наладжанага пад патранатам Еўрарэгіёна „Белавежская пушча" і дафінансаванага з еўрасаюзных сродкаў, уключыліся вучні са школ у Чыжах, Дубічах-Царкоўных, Кляшчэлях, Нараўцы, Дубінах, Гайнаўцы, студэнты з універсітэтаў у Варшаве, Беластоку і работнікі Асяродка адукацыі Белавежскага нацыянальнага парку. Пасля настаўнікі працавалі з вучнямі, а мы ездзілі па школах і паказвалі фільмы і вучылі як трэба збіраць матэрыялы. З фільмамі пабывалі мы тыдзень у Беларусі, а пасля праз тыдзень (да 20 снежня) вучні з Беларусі збіралі матэрыялы з нашай моладдзю на Гайнаўшчыне. Спачатку маладым людзям трэба было навучыцца як весці сябе ў іншай дзяржаве і знайсці падыход да старэйшых людзей, каб атрымаць ад іх патрэбную інфармацыю.

— Цяпер прадбачваецца выезд вучняў з Гайнаўшчыны ў Беларусь.

— 23 студзеня выязджаем мы з вучнямі і настаўнікамі ў Беларусь, каб там збіраць чарговыя матэрыялы. Плануем, што наша работа закончыцца варштатамі, якія будуць ладзіцца ў сакавіку і пасля навуковай апрацоўкі матэрыялаў хочам выдаць кніжку з міфамі і легендамі „Забытых таямніцаў чар".

— Аднак асноўная Ваша работа ў музеі гэта праца ў беларускай бібліятэцы, з якой Вы маеце дачыненне з канца 1997 года. Які быў пачатак?

— Я прыйшла на працу ў музей з прапановай, што наладжу бібліятэку. Тады было тут некалькі соцень кніжак. Яны былі схаваныя ў шафах, на якіх віселі замкі. Спачатку вычысціла я маміну бібліятэку і яе метадычныя кніжкі прывезла ў музей. Свае кніжкі перадаў нам былы дырэктар Гайнаўскага белліцэя Аляксандр Іванюк. Выступіла я з просьбамі дапамогі ў беларускіх кніжках у розныя раённыя газеты ў Беларусі. Газета „Навіны Камянеччыны" пачала збіраць кніжкі пры дапамозе школ. Пачалі дзяліцца з намі кніжкамі розныя ўстановы Брэстчыны. Да ідэі збірання кніжак для нашага музея падключыліся Брэсцкі універсітэт і газета „Народная трыбуна" з Брэста. Кніжкі перадавалі нам настаўнікі, а сярод іх выкладчык Брэсцкага універсітэта Уладзімір Калеснік.

— Я чуў, што вы многа кніжак раздабылі асабіста.

— Раней быў добры час. Я ездзіла ў Беларусь на сустрэчы, дзе збірала кніжкі, а шмат сваіх зарплатаў аставіла ў беларускіх магазінах, каб купіць там літаратуру. Часам мне гэтыя грошы звярталі, а часам не. Калі я вяртаюся з Беларусі, заўсёды ў дзвюх руках валаку кніжкі.

— У бібліятэцы ёсць таксама кніжкі з Амерыкі.

— Са ЗША прыслалі нам кніжкі Вітаўт Кіпель і Міхась Белямук. Шмат кніжак падкінула нам Згуртаванне беларусаў свету „Бацькаўшчына". Лідзія Гайдук перадала нам бібліятэку свайго мужа, а зараз я пішу заказы на кніжкі і ў меру магчымасцей рэалізуе іх Беларускае пасольства ў Варшаве. Зараз у нашай бібліятэцы знаходзіцца больш за 10 тысяч асобнікаў. Найбольш у нас мастацкай і метадычнай літаратуры для навучання беларускай мовы. Многа ёсць кніжак па гісторыі, геаграфіі і музыцы.

— Пра бібліятэку распытваюць таксама палякі.

— Звесткі пра нашу беларускую бібліятэку пайшлі далёка. Зараз, апрача вучняў Гайнаўскага і Бельскага белліцэяў, прыходзяць да нас за кніжкамі студэнты з Беластока і іншых гарадоў Польшчы. Звяртаюцца да нас за кніжкамі жыхары Еўропы і Амерыкі. Напрыклад, за матэрыялам пра нацыянальнае беларускае вяселле звярнуўся да нас праваслаўны святар з Амерыкі, які хоча аднавіць народныя традыцыі ў сваім прыходзе.

— Як з пастаяннымі чытачамі?

— У нас больш 400 актыўных чытачоў. Ёсць нават некалькі чытачоў, што бяруць па 10 кніжак нараз і прыблізна кожныя два тыдні наведваюць нашу бібліятэку.

— Якімі кніжкамі карыстаюцца найчасцей вучні і студэнты?

— Вучні найчасцей карыстаюцца апрацаваннямі літаратурных твораў. Студэнты часта шукаюць матэрыялы пра жыццё беларусаў у Польшчы і пачуццё беларускай тоеснасці.

— Вы таксама ўключаецеся ў рэалізацыю іншых музейных праектаў і грамадскую дзейнасць па-за музеем.

— Я належу да Таварыства аховы краявіду, якое апошнім часам моцна ангажуецца ў справы аховы Белавежскай пушчы. Займаюся перакладчыцкай дзейнасцю, карыстаючыся трыма мовамі — беларускай, рускай і польскай.

— Таварыства аховы краявіду ангажавалася ў прапагандаванне прымянення ў нас на практыцы двухмоўя.

— Нашы прапановы занадта не пераконваюць беларускае асяроддзе. Калі моладзь не возьме гэтых спраў у свае рукі, то старэйшыя людзі нічога не зробяць у адносінах да двухмоўя.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Фота з архіва

Беларускі музей у Гайнаўцы

Пашана закону

Аб тым, што чыноўнікі парушаюць законы і не нясуць за гэта адказнасці прыкладаў хоць адбаўляй. Пакарыстаюся першым з боку. 28 кастрычніка прыехаў я з сябрам на машыне ў рэдакцыю. Кантралёр сектара кантролю і зоны платнай паркоўкі выпісаў штраф за „неаплачаную стаянку". Справу паспрабавалі мы растлумачыць начальніку сектара па вуліцы Складовай. Без рэзультату. Паслаў я прашэнне (як інвалід) прэзідэнту Беластока аб пагашэнні платы. Намеснік прэзідэнта сканстатаваў: „можна растэрмінаваць" (чытай допіс „Штрафуюць" у 50 н-ры „Нівы" ад 11 снежня 2005 г.). 2 снежня Беластоцкае тэлебачанне ў перадачы „Szerokiej drogi" паінфармавала, што штрафаванне шафёраў за неаплачаную стаянку на вуліцы „ў зоне платнай паркоўкі", па думцы абаронцы грамадзянскіх правоў, з'яўляецца незаконным дзеяннем. Я не здаўся, паколькі лічыў, што закон на маім баку. 7 снежня 2005 г. я паўторна паслаў заяву прэзідэнту Беластока Рышарду Туру прыкладаючы адначасова копію „Карты паркоўкі няпоўнаспраўнай асобы". У адказе Or.II 0565-119/06 ад 9 студзеня 2006 г. чытаем: „W związku z tym, że Pan nie jest właścicielem pojazdu (...) ani też nie prowadził Pan niniejszego pojazdu w dniu wystawienia mandatu, przychylam się do prośby i umarzam należność (...) z tytułu nie wniesienia opłaty za parkowanie...". І далей: „Odnosząc się do informacji wyemitowanej przez Telewizję Białystok (...) przypominam, że tut. Urząd działa zgodnie z przepisami powszechnie obowiązującego prawa". Па-мойму, штосьці не так. Прэзідэнт паясняе, што пагашае плату дзеля таго, што я не з'яўляюся ўладальнікам аўтамабіля і не ехаў на гэтай машыне ў дзень выпісання штрафу. Дык у чым справа? На карце паркоўкі няпоўнаспраўнай асобы ў паясненні напісана: „Karta parkingowa potwierdza uprawnienie: a) właściciela karty, b) kierowcy przewożącego właściciela karty do korzystania z ulg i przywilejów określonych w przepisach ruchu drogowego". Варта прыкмеціць, што дакумент важны „bezterminowo".

Уладзімір Сідарук

Не забыты дзеяч

Былы старшыня Грамадскага камітэта пабудовы Беларускага музея ў Гайнаўцы Канстанцін Майсеня ўжо больш за год прабывае ў бальніцы. З вялікім хваляваннем трымаў ён паштоўкі з навагоднімі і каляднымі віншаваннямі, якія даслалі яму пасол Рэспублікі Беларусь Павел Латушка і генеральны консул РБ у Беластоку Леанід Каравайка. Дыпламаты жадалі хвораму дзеячу беларускага грамадска-культурнага руху вяртання да здароўя, радасных дзён і ўсялякіх поспехаў у жыцці. Да гэтых шчырых пажаданняў, якія так узрадавалі і ўсхвалявалі ганаровага старшыню Канстанціна Майсеню і яго жонку Анастасію далучаецца ніжэйпадпісаны

Віктар Бура

Па-польску і па-беларуску

Фота ДАНЕЛЯ ЗНАМЯРОЎСКАГА

Сустрэча бібліятэкараў Гродна і Беластока

У рамках Нацыянальнай праграмы для Польшчы, Фонду малых праектаў, Фонду „Польская ўсходняя мяжа", праграмы „Phare 2003" у снежні 2005 г. у Гродне сустрэліся прадстаўнікі Падляшскай бібліятэкі імя Лукаша Гурніцкага ў Беластоку (Ян Леанчук, Віктар Швед, Данель Знамяроўскі) з прадстаўнікамі Абласной навуковай бібліятэкі імя Яўхіма Карскага ў Гродне, якую ўзначальвае Лідзія Мальцава. Сустрэча датычыла праекта „Літаратура без падзелаў — пыглыбленне літаратурна-культурных сувязей Беласточчыны і Гродзеншчыны". Да галоўных прынцыпаў праекта належыць наладжанне шырокага супрацоўніцтва ў галіне літаратуры ды абмен літаратурна-культурным вопытам Польшчы і Беларусі. Рэалізацыя гэтага праекта паможа паглыбіць супольныя літаратурныя традыцыі паміж мясцовымі групамі ў памежным рэгіёне Беласточчыны і Гродзеншчыны. Дзякуючы гэтаму будзе развівацца супольная культурная спадчына. Літаратура, даклады і выстаўкі, якія будуць адбывацца ў абсягу праекта, будуць спробай вылучыць тое, што супольнае. Фінальным вынікам будзе выданне дзвюх двухмоўных анталогій (першая — анталогія твораў для дзяцей, другая — паэтычная анталогія). Стануць яны прамоцыяй літаратурна-культурных каштоўнасцей абодвух народаў, будуць фактарам будуючым масты паміж народамі і вядучым да дыялогу паміж Польшчай і Беларуссю, што можа памагчы ў пераадольванні стэрэатыпаў. У зборнікі ўвойдуць таксама творы аўтараў з Беларусі, якія пішуць па-польску і беларускіх паэтаў з Польшчы.

Гродзенская сустрэча, наладжваючая кантакты паміж бібліятэкамі, і знаёмства з аўтарамі, якія будуць публікавацца ў анталогіях, была таксама нагодай да люднай аўтарскай сустрэчы з юбілярам з Беласточчыны — Віктарам Шведам. Аддарунак за вершы атрымаў ён сапраўды юбілейны — з новымі песнямі на ягоныя творы (музыка Анатоля Куніцкага), і гімн „Шведу — паэту непаседу" Яўгена Петрашэвіча. „Гродзенская праўда" пяром Юркі Голуба ўшанавала ў змястоўным інтэрв'ю жыццёвы і творчы шлях паэта з Беласточчыны.

У другой палове сакавіка 2006 г. у Падляшскай бібліятэцы імя Л. Гурніцкага будзе праводзіцца навукова-літаратурная канферэнцыя „Значэнне польска-беларускіх літаратурных сувязей. Учора, сёння і заўтра". Будзе гэта нагодай паказаць адрознасці і падабенствы ў літаратуры абодвух народаў, таксама і магчымасцю падзяліцца культурнымі набыткамі з партнёрам. Пасляканферэнцыйныя матэрыялы таксама будуць выдадзены па-польску і па-беларуску.

(лук)

Змаганне з зімою

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Абаяльная павятовая дарога з Орлі ў Шчыты

Паводле паведамлення Управы рады Бельскага павета Павятовая ўправа дарог апрацавала, так як і ў мінулых гадах, план зімовага ўтрымання павятовых дарог у сезоне 2005/2006, адобраны 28 снежня 2005 года. Прыёмы гэтага мерапрыемства ў вялікай меры залежаць ад фінансавых магчымасцей павета; на гэтую мэту адведзена ў бюджэце звыш двухсот тысяч злотаў, што для 653 кіламетраў павятовых дарог дае каля трохсот злотаў на адзін кіламетр дарогі. Дзеля параўнання: Раён краёвых дарог расходвае на такі ж кіламетр пяць з паловай тысячы злотаў.

У Бельскім павеце павятовыя дарогі падзелены на дзве катэгорыі: V і VI, а гэта абазначае, што зімовыя акцыі ачышчання ад снегу і галалёдзіцы праводзяцца на інтэрвенцыйны лад, г.зн. пасля спынення ападкаў. У такой сістэме дапускаюцца перапынкі ў праезнасці дарог, замінкі ў выглядзе заезджанага снегу і звужэння праязной проразі. У кастрычніку мінулага года шляхам таргоў былі вызначаны выканаўцы паслуг датычных зімовага ўтрымання дарог. Павятовая ўправа дарог дзеля расчысткі ад снегу можа распараджацца трыма грузавікамі з клінаватымі плугамі, шасцю грузавікамі з косымі плугамі, адным ротарным плугам, пяццю грэйдэрамі, двума трактарамі з косымі плугамі і адным загрузчыкам, а для змагання з галалёдзіцай адным салямётам і трыма пескамётамі з косымі плугамі.

Для змагання з галалёдзіцай нарыхтавана шэсцьсот тон тармазных сродкаў (пяску з соллю). Соль для роспуску галалёдзіцы мае пастаўляць фірма „Максбуд". З паловы лістапада мінулага года ў дарожных акругах у Бельску і Браньску ўстаноўлены кругласутачныя дзяжурствы па зімовым утрыманні дарог. Усім мясцовым самакіраванням і выратавальным службам былі разасланы прынцыпы зімовага ўтрымання дарог і нумары дзяжурных тэлефонаў.

* * *

Зімою інакш выглядаюць дарогі гмінныя. Управа Арлянскай гміны даглядае дарогі і расчышчае іх плугамі. Калі пасля адлігі і марозу на дарогах з'явіўся чысты лёд, ніхто з ім не змагаецца. Пры „камуне" ў Орлі дзейнічаў пункт Павятовай управы мясцовых дарог, але ад многіх гадоў гэтай установы ўжо няма. Лёд моцна і доўга трымаецца на малаезджаных дарогах і вуліцах; асабліва небяспечна на скрыжаваннях, якіх ніхто нічым не пасыпае. На павятовай вуліцы Бельскай у Орлі праводзяцца раскопкі для пракладкі каналізацыйных труб; вуліца закрыта для руху і аўтобусы аб'язджаюць яе па абледзянелай вуліцы Аградовай...

Міхал Мінцэвіч

Турыстычная чыгунка

Новы расклад паяздоў, што паявіўся ў снежні, вярнуў ранішні цягнік з Беластока ў бок Седльцаў. Цяперашні рэйкавы аўтобус пакідае Беласток на гадзіну пазней, чым ягоны колішні папярэднік, а гэта дазваляе без спешкі адправіцца ў падарожжа па Падляшшы ў камерных абставінах выгаднага вагончыка-салончыка. Ёсць тут толькі адна нявыгада: гэтае новаўвядзенне не вяртае ранішняга пасажыра дахаты. Каб вярнуцца ў Беласток трэба недзе зачапіцца на начлег або шукаць дарогі дадому ў канкурэнтаў нашай дзяржаўнай чыгункі; яны павінны быць удзячны чыгуначным чынам за такі шчодры рыначны падарунак.

У салоне прасторна, цісканіны няма. Пасажыраў удвая менш чым месц, у прынцыпе едуць самотна. І машыніст працуе быццам у офісе, пад гальштукам; не тое, што калісь у паравозе. На экранчыку перад ім агляд пасажырскага салона з тэлекамеры. Перад пасажырамі табло з датай, гадзінай, актуальнымі імянінамі. За акном зімовы краявід у поўнаснежнай красе. Час ад часу на яго нерухомым фоне паказваецца мабільная прырода.

Між Беластокам і Бельскам на прычыгуначных вяршках дзяжурыць некалькі каршакоў. Бо грукат машыны можа выпудзіць з навакольных кустоў нейкую смакавітую спажыву. Каля Райска, у полі, красуецца і лісіца ў пышным футры — таксама назірае, ці што не выскачыць на снежны стол. Дзе-нідзе перабягаюць казулі.

У Бельску, куды рэйкабус з'яўляецца дванаццаць мінут пасля восьмай гадзіны раніцы, з машыны сходзяць лічаныя адзінкі. Каля дваццаці чалавек высыпаецца з сустрэчнага міні-поезда, што прыкаціўся з Чаромхі.

Будынак чыгуначнага прыпынка ў Падбеллі крыху нагадвае крэпасць з браніраванымі непразрыстым матэрыялам вокнамі. Прыпынкі ў Галоўках і Райску таксама ў асадным становішчы перад галоднымі занятку вандаламі. Бо, мабыць, і чалавек, якога разрывае патэнцыяльная энергія, на свой лад хоча памеціць тэрыторыю; на іншы лад мецяць тэрыторыю сабакі.

Дарога з Падбелля ў напрамку Тапчыкал два дні раней была прыгожа расчышчана ад снегу, таму яна і прывабіла мяне, каб па ёй прайсціся. Але на гэты раз, калі я даверліва ўключыў яе ў свой маршрут, яна акуратна зацягнута снегам. Няма на ёй чалавечага следу, хаця ёсць сляды нашых меншых кіпцюрыстых братоў — сабак. Іду ўлукаткі: крыху дарогай, крыху полем. Снегу толькі да кален, таму не рашаюся на абыход гэтага двухкіламетровага адрэзка праз Кошкі.

Ад шашы Бельск — Кляшчэлі кіламетровая дарога ў Тапчыкалы акуратна расчышчана. І на такой дарозе можна сваю ўвагу засяродзіць не на змаганні ног са снежнымі каварствамі, але на сузіранні таго пейзажнага багацця, якое прапануюць нам зіма з роднай зямелькай.

Выгадны агляд прывабных пейзажоў з розных канцоў свету прапануе нам тэлевізар. Больш: усе сродкі масавай інфармацыі, што дастаўляюць у нашы кватэры візуальныя лакоцці, вабяць нашы вочы прыроднымі і антарапагеннымі цудамі. Седзячы ў фатэлі або нават лежачы ў ложку можна з дапамогай своеасаблівых сучасных эрзацаў залатой рыбкі — тэлевізійнага пульта і камп'ютэрнай мышкі — забрацца за трыдзевяць зямель: у іглу эскімосаў, у юрту манголаў, у Версаль, у Букінгем. Нашы агратурыстычныя кватэры таксама далучаюць да гэтай сусветнай феерыі і нашы каштоўнасці; праўда, іх напорыстасць не звальвае з ног. Гэта не толькі пра рэкламу, але і пра інфраструктуру, пра якую дагэтуль і была мова.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вуліца ў Тапчыкалах

На вуліцы ў Тапчыкалах жанчына прыглядаецца мне, незнаёмаму вандроўцу. Калі выяўляю, з якой я мэтай у ейнай вёсцы, ахвотна заводзіць гутарку. Асноўная праблема Тапчыкал — дарогі. Нядаўна памёр там вясковец; у той час і дарогі зацягнула снегам. Званілі ў гміну, у Орлю, каб прачысціць дарогі да бельскай шашы, ад якой спадзяваліся прыезду радні пакойніка. Чакалі дапамогі доўга і дарэмна. Сталі шукаць паратунку з Бельска, паспяхова. Машына з'явілася познім вечарам, расчысціла дарогу не толькі да бельскай шашы, але і на могілкі, што ў напрамку Пашкоўшчыны.

І дарога, што з Тапчыкал у Орлю, не дастаўляе радасці. Не мае яна цвёрдага насцілу і ў час палявых прац, якія побач яе праводзіць пражываючы ў Кашалях плантатар цукровых буракоў, дарога тая нішчыцца. Калісь былі побач яе равы, цяпер яны зацягнуты цяжкімі машынамі. Прыставілі да яе дарожны знак, забараняючы ўезд цяжкіх грузавікоў. Яны з'яўляюцца па буракі парожнімі, а з грузам выязджаюць пад шырмай ночы...

Большасць хат у Тапчыкалах з драўніны, толькі з боку Орлі крыху мураванак. І хаця некаторыя з іх пустуюць, аднак выдатна захаваны традыцыйныя мясцовыя будаўнічыя прыёмы, захаваны тыповы архітэктурны лад нашай вёскі. На разгалінаванні дарог, ад якога і згаданая тая ў бок месца вечнага спачынку, два вартыя ўвагі вывадныя крыжы. І пры некаторых хатах высокія драўляныя выявы мясцовай рэлігійнасці.

Кіруюся да солтысавай хаты, што ў канцы Тапчыкал з боку Орлі. У клуні працуе малацілка, якую калісь называлі камбайнам. Хачу вярнуцца на вуліцу, але гаспадар заўважае мяне, выбягае. Гутарка кароценькая, бо з-за працы няма для размовы часу. Мой суразмоўца не карыстаецца сучаснымі ўборачнымі збожжавымі камбайнамі, каб не губіць па полі ўсяго таго кармавога багацця, што спадарожнічае збажыне. Палову ад абмалоту дадасць да буракоў у корм жывіне. І за камбайн не трэба плаціць. За малацілкай, з электраматорным прыводам, працуе тройка сямейнікаў.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вывадныя крыжы

Згаданая раней дарога ў напрамку Орлі выглядае як сцёкавая рачулка на выпадак наваднення палей. У снежную і марозную зіму раз'ездженых каляін не відаць. За вёскай шукаю памечаную на тапаграфічнай карце дарогу ў Спічкі. Знаходжу; гэта сялянская дарога з вёскі ў поле. У неабкошанай траве выгадна залегчы снегу, якому там ніхто не перашкаджае. І я іду верхам паралельнага загона. З узвышша паміж дзвюма вёскамі любуюся краявідам, якога ў тэлевізары не даводзіцца бачыць. І водар тут непаўторны.

Па дарозе са Спічкоў у Парцава, якая дзе-нідзе прабіваецца праз снежныя гурбы, прабіваецца і „малюх"; яго вадзіцель запрашае мяне, хоча падвезці. Дзякую яму, бо мне шкада тае пейзажнае насалоды. У Парцаве дарога ледзянее, а за вёскай чым бліжэй Бельска, тым чарнейшая, на якой няма чым любавацца. Тут і большыя машыны, і больш важныя вадзіцелі: ніхто ўжо не прапануе падвезці пешахода.

Аляксандр Вярбіцкі

Сямятыцкія інвестыцыі

На зломе старога і новага года часта падводзім вынікі, аналізуем здзейсненае ў мінулым. Такі агляд карысны кожнаму чалавеку, бо тады можна заўважыць тое, што неабходна змяніць у будучыні ў самім сабе і навокал сябе. Гэта таксама карыснае ў большым маштабе, напрыклад, у маштабе павета ці горада.

Калі гаварыць пра Сямятычы, то 2005 год для горада быў добрым. Перш за ўсё карысна змяніўся вонкавы выгляд горада. На цэнтральнай плошчы з'явіўся фантан, пры якім гуртуюцца не хуліганы ці п'яніцы, чаго апасаліся многія гараджане, але звычайныя людзі: маці з малымі дзяцьмі, пенсіянеры ці стомленыя мінакі. Шматлікія вуліцы атрымалі новыя тратуары і асфальтавае палатно. Асабліва бачна гэта на вуліцы Славічынскай, якая да нядаўна ўвогуле не мела тратуараў і ліхтароў, а цяпер можна па ёй бяспечна і выгадна дайсці ў сам Славічын. Падобна справа маецца на вуліцы Гурнай, на якой шырокі і роўны тратуар пракладзены аж да распаложанага за горадам могільніка. Некалькі чарговых вуліц (напрыклад, Главацкага, Студзеньскага паўстання) атрымалі новую санітарную каналізацыю.

Пабудавалі купальны басейн, паколькі вада ў залівах не заўсёды настолькі чыстая, каб летам можна было ў іх купацца. Пачаўся генеральны рамонт старадаўняга ветрака — гарадской візіткі, якую бачаць прыезджыя з напрамку Любліна і Варшавы. У новым сацыяльным жылым будынку неўзабаве паселіцца 9 сем'яў (на такія кватэры чакае яшчэ каля 30 сем'яў). Пачаліся будаўнічыя працы пры цеплаэлектрастанцыі, якая будзе скарыстоўваць біямасу. Гэтая інвестыцыя, вартая 30 млн. зл., якая аж у 90% можа быць прафінансаваная еўрафондамі — дазволіць абнізіць цану цеплавой энергіі, што ў недалёкай будучыні дасць магчымасць збудаваць танным коштам крыты басейн для плавання.

Аднак бурмістр Збігнеў Радомскі і Гарадская рада самымі важнымі для горада палічылі дзве інвестыцыі, якія створаць каля тысячы працоўных месцаў. Бельская фірма „Максбуд" будуе завод бітумічных мас, а вядомая фірма „Пронар" з Нарвы адкрыла ў горадзе свой філіял. Адзінай сур'ёзнай праблемай філіяла можа быць адсутнасць на мясцовым рынку працы адпаведнай колькасці кваліфікаваных работнікаў.

Шкада, што за развіццём сталіцы павета не паспяваюць гмінныя цэнтры. Там таксама можна зрабіць вельмі многа, але, здаецца, што не ўсюды войты і дэпутаты заўважаюць магчымасць выкарыстання новых інвестыцыйных умоў, якія з'явіліся ў Польшчы пасля яе далучэння да Еўрапейскага Саюза. Можа папросту не стае там адпаведных людзей на адпаведных пасадах?

М. Ц.

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

Зорка

для дзяцей і моладзі

Вітай „Зорка”!

Пішуць Табе вучні III „д” класа Пачатковай школы н-р 3 у Бельску-Падляшскім з настаўніцай Валянцінай Бабулевіч. Мы хочам расказаць, як правялі ў нашым класе Каляду. 21 снежня ўсе мы ішлі ў школу вельмі ахвотна, бо ў той дзень былі ў нас незвычайныя ўрокі. З нашай настаўніцай Ірэнай Кандрацюк і настаўніцай беларускай мовы мы прыгатавалі святочную вячэру, на якую запрасілі паню дырэктар і бацюшку. Вядома, многа дапамагалі нам нашы мамы і бабулі, якія падрыхтавалі вельмі смачныя калядныя стравы. З мамай нашага сябра Беніяміна мы пяклі нават пернікі. Усё так пахла, што цяжка было нам дачакацца, калі сядзем за стол. Але чакала нас яшчэ многа працы. Мы ўпрыгожвалі клас папяровымі цацкамі, упрыгожылі таксама ёлку, а ў кутку павесілі „госця”. Многа часу заняло нам прыгатаванне сталоў, на якіх ляжала пахучае сена і прыгожа выглядалі белыя абрусы. Нам яшчэ трэба было назваць і падпісаць па-беларуску стравы, якія мы паставілі на стале. Пасля доўгай працы мы моцна прагаладаліся і з вялікім апетытам елі ўсе стравы, спявалі таксама калядкі. Гэты дзень мы будзем памятаць вельмі доўга.

Вершы Віктара Шведа

Плаксівая дзяўчынка

Горка плача доня малая.
— Скуль яна? — сын маму пытае.
Адказала сыну мамуся:
— Прынёс яе з Афрыкі бусел.

— Дык мы ўжо, матуля, без шанцу,
Здаволены там афрыканцы,
Яны зажылі ўжо шчасліва,
Калі пазбыліся крыклівай.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Перад пастаноўкай „Калядоўшчыкаў” паўсюдна адчуваецца напружанасць, сям-там плачуць наймалодшыя дзеткі. Стрэс як у сапраўдным тэатры...

Барвовыя калядоўшчыкі

— Ой, даруйце, — просіць прабачэння „гаспадыня”, — у мяне такое хваляванне! Пагаворым пасля спектакля.

Перад пастаноўкай „Калядоўшчыкаў” паўсюдна адчуваецца напружанасць, сям-там плачуць наймалодшыя дзеткі. Стрэс як у сапраўдным тэатры. Не дзіва, пастаноўкі, якія рыхтуюць у беларускім садку, барвовыя і цікавыя. Вось і сёння за калядным сталом сабралася вялікая сямейка. Бабуля (Ева Заброцкая), бацька (Марк Кулакоўскі), гаспадыня (Анна Цішук), васьмёра малых дзяцей, жанаты сын з нявесткай і немаўляткам (Івона Жук і Марыюш Гічан), шасцёра сынкоў ды дзве дачушкі. У сямейным кругу, як з веку ў век, старыя павучаюць малых, напамінаюць пра рытуалы і асаблівасці Каляд. Бацька, як прыстоіць — галава, бабуля — народная мудрасць, маці — увасабленне дабрыні.

Ёсць застолле і абрадавыя стравы, ёсць калядкі, варожбы і гульні. Менавіта, барвовую частку спектакля складаюць „экзатычныя” калядоўшчыкі — цыганка-варажбітка (настаўніца Данута Тымашэвіч) і цыган-гандляр коней (Славамір Якімюк). Спектакль ставяць у прадшколлі ўжо чарговы раз, аднак кожны раз ён жывейшы ды ўзбуджае радасныя перажыванні. У такія моманты і дзеці, і бацькі адчуваюць прыгажосць і мудрасць нашай спадчыны. І гэта не канец атракцыёнам, пасля ўсе разам калядуюць за багатым, святочным застоллем. А запрошаныя госці, узрушаныя прыгожай пастаноўкай, дораць ласункі і цацкі.

Зорка

Падарункі Дзеда Мароза

У беларускі дзіцячы садок у Беластоку завітаў пасланец ад беларускага Дзеда Мароза — пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Павел Латушка, разам з гасцьмі з беластоцкага Генконсульства. Прывезлі яны ў падарунку дзеткам беларускія ласункі ды каляровыя і займальныя кніжкі. Не абмінуў Дзед Мароз і выхавацелек! — аб іх, як і аб усім садку, расказала яму Яна Латушка, якая калісьці хадзіла ў гэты садок, вывучала разам з іншымі дзецьмі беларускую мову і традыцыю. А ў садку вывучылі шмат новага — новыя беларускія песні і танцы, новыя групы пазнаёміліся з абрадавымі п’есамі, якія здаўна ставяць у садку дзеці разам з настаўніцамі ды бацькамі. Сёння таксама праспявалі сабраным — бацькам, бабулям з дзядулямі ды гасцям — новыя песні, натанцаваліся, пачаставаліся. Бо ў садку — як дома. А падарункамі ўсе вельмі цешыліся — прыехалі яны з марознай Беларусі спецыяльнай кур’ерскай поштай. Праўда, не на санях... **(лук)**

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Тры Паўліны і Паўл

У першы дзень Новага года па старому стылю Паўліна Ш. пашкадавала сваіх косаў-„дрэдаў”.

У Шчодры вечар ёй не хацелася шалець, наадварот, яна пайшла на кухню і стала мыць талеркі ды кубкі пасля шакаладу. Пасля ўселася ля тэлевізара і разам з маленькай сястрычкай глядзела тэлеперадачу пра афрыканскіх звяроў.

Папраўдзе Паўліна Ш. не любіла быць „непрыкметнай”. А зараз, як яна зразумела, ніхто ёю ўжо не цікавіцца. Нават той Паўл, які раней рабіў усё, каб каля яе прысесці ды перакінуцца словам. І гэта не канец пераменам. Сталася дзіўная рэч! Уся ўвага і захапленне, якія раней належалі Паўліне Ш. перайшлі на іншую асобу. І каб вы ведалі на каго!? На тую... гіперпляткарку Іголку.

— А, ведаеце, — сакатала тая як катрынка, — а ведаеце, што зрабіла Паўліна Ш. са сваімі „дрэдамі”.

— Што? Што? — цягнулі яе за язык сябры.

— Не скажу, — правакавала тая, — бо яна... яна іх прадала!..

Праўда, Паўліна Ш. чула ўсе сенсацыйныя сцэнарыі сяброўкі, але ёй не хацелася нічога каментаваць. Яе не цікавілі ўяўныя высновы сяброўкі. Яна не хацела такіх гутарак. Гэта засранства, думала. Зайздрасць такая.

— Зараз яе „дрэды” будзе насіць Паўліна Б., — хіхікала пляткарка, — каб захапіць сабой аднаго хлопца.

Пляткарцы было зручна смяяцца з непрысутнай Паўліны Б., якая, як вядома, засталася дома.

Пасля Іголка падняла ўсю кампанію і стала намаўляць, каб вычвараць адмысловыя фокусы.

— Пазначым дарогу ад Паўліны Б. да Марціна!

У Гагатуху такая ўжо традыцыя, што значаць сцежкі-дарожкі паміж закаханымі. Лёгка гэта зрабіць у вёсцы. Пасыплеш дарогу па снезе попелам або саломай, часам сокам з чырвонага бурака і ўсе наўкол ведаюць. Нават у суседняй вёсцы.

У горадзе гэта больш складана. Але і тут наша Іголка прыдумала спосаб:

— Перад пад’ездам Паўліны Б. мы напішам, што яна кахае Марціна, нашмаруем сэрца прабітае стралой Амура. Ха-ха-ха! Хай усе ведаюць! Ха-ха-ха!

— У нас жа няма спрэю, — адазваўся паўпрытомны Паўл.

— Дурны ты, — папракнула яго Іголка, — надпіс зробім кетчупам, каб выглядала як... кроў!

— Іес! іес! іес! — падхапіла ўся кампанія.

(працяг будзе)

Арабінка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Галерэя „Зоркі” (Бельск)

Гжэсек Лаўранюк

Сярэдняя ацэнка на пасведчанні — 4,5.

Мая мянушка — не маю мянушкі.

У жыцці хачу стаць, чаму — пажарнікам, таму што хачу гасіць агонь.

У сяброў цаню — праўдзівасць, добрасумленнасць.

Не люблю — ашуканства, хітрасці.

Па-беларуску размаўляю — з бабуляй, дзядулем, часам з бацькамі.

Мой любімы гурт — пакуль не маю.

Каля свайго дому пасаджу — дрэвы і вельмі многа ружаў.

Міра Лукша

Гражынка і Грак

- 11 -

Грак першы раз быў у школе. Праўда, не на ўроках, а ў спартыўнай зале, дзе праводзілася карнавальная дыскатэка. Ды яшчэ не ў зале, з якой далятала гучная музыка, а ў гардэробе. Папраўдзе, сядзеў яшчэ ў Гражынчынай торбачцы. Скураную сумку падарыла ёй бабуля. Грак стаяў на дне, сценкі торбачкі тырчалі яму па баках, а аддуваўся праз расчынены верх, закончаны залатой бубкай, якая, калі сціснуць пашчу сумкі, рабіла „клік!” і сашчамляла абодва бакі. Зусім, як сумачка адной незямной жанчыны з аднаго фільма, з якой выскоквала незямное стварэнне — Грак бачыў той фільм і якраз тое найбольш з усяго спадабалася. Тут адно яму перашкаджала — збоку, засунуты ў другую кішэньку, электрамагнітна пульсаваў Гражынчын мабільнік. Добра, што хоць маўчаў ён, але хвалі Грак адчуваў вельмі моцна.

Гражынка папраўляла свой строй маладой чараўніцы-варажбіткі. Цыганская спадніца з квяцістай вялікай хусткі, на чырвонай блузцы некалькі вязак караляў, на распушчаных кудзерках — жоўтая хустачка павязаная назад, у вушах срэбныя колы...

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— Знакаміта! — Грак вылез з сумкі, сеў на залатую бубку і стаў любавацца сяброўкай.

— Ты ціха сядзі! — замахала рукамі дзяўчынка. — Залазь назад.

— Я не прыехаў сюды, каб у торбе сядзець, — пакрыўдзіўся Грак. — Я ж — элемент твайго касцюма, так сказаць.

— Прыйдзе Косця, пакрыўдзіць цябе яшчэ... Чаго ж цябе я брала, не падумала пра яго...

— А што, такі благі той Косця? Птушак крыўдзіць?

— Можа і не такі благі, ды бяздумны. Махае рукамі. Да чаго дакранецца, усё псуецца.

— Дык, можа, гэта выпадкова? Бывае ж такое і сярод птушак!

— Рыжая, рыжая ведзьма! — у гардэроб убег беленькі хлопчык.

— Ты гэта так на маю Гражынку?! — Грак учаперыўся яму ў светлыя валасы. — Я на баль сюды прыехаў, і такое чую?!

Косця з лямантам вырваў з гардэробу. Грак ускочыў на залатую бубку:

— Ну, справа афармлена. Ідзем гуляць. Трэба выхоўваць маладых!

Міра Лукша

Польска-беларуская крыжаванка № 5

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 1: Там, эсэ, густ, там, баран, мора, Жан, ласяня, хор, клас, на, ружа, гук. Спор, агат, сажалка, этнас, няхай, нос, яр, дар, ну, малюнак.

Узнагароды, алоўкі і гумкі, выйгралі: **Магда Леановіч, Рафал Скепка** з Дубін, **Кася Піскорская** з Гайнаўкі, **Юліта Кананюк, Паўліна Лук’янюк** з Нарвы. Віншуем!



Цана беларускай шчырасці

- 2 -

У 1971 г. справай Сакрата Яновіча не займалася ўжо Ваяводская камісія партыйнага кантролю пры Ваяводскім камітэце ПАРП у Беластоку. Дасталася затое іншым журналістам, якія выводзіліся з нацыянальных меншасцей ці спрыялі ім — Збігневу Насядку і Уладзіміру Паўлючуку. Падобна як год таму Сакрата Яновіча, у гэты раз гэта іх выкінулі з партыі.

Гэта вынікае з артыкула гісторыка Тамаша Данілецкага, апублікаванага ў апошнім бюлетэні Беластоцкага аддзела Інстытута нацыянальнай памяці. Тыдзень раней пісалі мы аб даносе, які супраць Сакрата Яновіча зрабіў пазней папулярны пісьменнік Аляксандр Амільяновіч, асуджаны нядаўна на чатыры з паловай года за здзекі і катаванне дзеячаў сувальскага вызвольнага падполля ў 1946-1947 гг. Справа заключалася ў лісце, які пісьменнік з Крынак-Беластока праз пасрэдніцтва паэтэсы Ларысы Геніюш перадаў гродзенскаму літаратару Аляксею Карпюку, ужо тады, а асабліва пасля, быўшаму на прыцэле КПСС, ды асабліва КДБ і самога ягонага шэфа Юрыя Андропава. Быў гэта адказ на ягонае — як гэта назвала тагачасная ўлада — рэвізіяністкае выступленне ў час V З'езда Саюза пісьменнікаў БССР у 1966 г. Дзякуючы Амільяновічаваму даносу — як кажа Тамаш Данілецкі — кар'ера Сакрата Яновіча была спынена на некалькі гадоў. Як мы ўжо пісалі, Яновіча не толькі выкінулі з ПАРП, але таксама і з БГКТ, са Згуртавання польскіх журналістаў ды пазбавілі працы ў „Ніве", крыніцы ўтрымання. На „дыванік" у яго справе ў 1970 г. вызвалі галоўнага рэдактара „Нівы" Георгія Валкавыцкага. Вось другі фрагмент з яго ўспамінаў са спаткання, якое датычыла таго пісьма ў дваццаць старонак і пазіцыі Сакрата Яновіча:

— Нахлынула злосць (начорта, блазнюк, выслаў свой „рапарт" за мяжу!) і жаль (чаму, трапіўшы ў бяду, не параіўся, як выбрацца?). Поўная затоенасць, у якой адбываўся партыйны суд над Яновічам, давала падставу да розных меркаванняў. Таму, відаць, Кірылюк і пераконваў мяне: „Не ўспрымайце рашэння камісіі як выхад супраць беларусаў. Справу разбіралі дэталёва. Каб не тычылася „Нівы", перадалі б у суд. Робім скідку, бо не хочам мець у Беластоку «нацыянальнага працэсу»". Цяпер усё, чым мог я аблегчыць долю свайго супрацоўніка, — гэта развітацца з ім па „дамоўленасці бакоў".

У матэрыялах публікаваных ІНП чытаем, што Сакрат Яновіч „атрымаў трохмесячнае *wypowiedzenie* з працы ў „Ніве", аднак канчаткова адмовіўся ад працы на два месяцы да яго канца, 1 лістапада. На яго прозвішча і творы было наложана эмбарга.

Некалькі месяцаў пазней Аляксандр Амільяновіч пачынае выданне цэлай серыі кніг, прысвечаных сваёй дзейнасці (мала звязанай з гістарычнай праўдай), аб II сусветнай вайне, партызанцы, ганьбуючых г.зв. вызвольнае падполле. У 1971 г. узнікае адна з ягоных найславутых кніг таго часу „Duch Białowieży", пасля перавыдаваная шмат разоў. Аўтар сустракаецца з чытачамі. Адзін з іх, тады вучань пачатковай школы, успамінае:

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— Бабуля загадала хадзіць мне з ёю на сустрэчы. Была „веруючай" партыйнай дзяячкай, радавой. Пасля я даведаўся, што гэта было па партыйнаму загаду.

Тым часам, амаль пасля таго, як Сакрат Яновіч атрымаў „воўчы білет", у Польшчы настаў Эдвард Герэк. Георгій Валкавыцкі пад датай 1972 г. пісаў: „5 студзеня высадзіўся ў Беластоку варшаўскі дэсант. Адбылася перафарміроўка ваяводскіх вярхоў. Партыйную арганізацыю ўзначаліў малады і напорысты Здзіслаў Куроўскі (дагэтуль старшыня ГП ЗМВ)". Незалежна ад напруг паміж „дэсантам" і партыйным „бетонам" і пяцігадовай анафемай кінутай у 1970 г. на Сакрата Яновіча і яго публікацыі, ужо 27 жніўня 1972 г. на старонках „Нівы" зноў паказваецца яго тэкст. Як ён сам успамінае, не паказваўся ў рэдакцыі, а гэты і наступныя тэксты высылаў поштай. Артыкул паказаўся ў правым рагу трэцяй старонкі пад загалоўкам „Далечыні Крыншчыны". Было гэта быццам бы звычайнае апісанне Крынак і наваколля. Ужо па першых сказах, відаць, аднак, стан душы аўтара і яго ўспрыняцце паслягамулкаўскай і раннегеркаўска-куроўскай рэчаіснасці: „На Крыншчыне няма: ні рэдкіх птушак, ні незвычайных звяроў, не лічачы нядаўняй пары зуброў у навакольнай пушчы". Мусіць прамінуць яшчэ год, каб паказалася ягоная першая кніга, як успамінае пісьменнік, выдадзеная ў „Іскрах" дзякуючы іншаму пісьменніку (варшаўскаму) і перакладчыку, пасля звязанаму з апазіцыяй — Віктару Варашыльскаму. У тым жа годзе прымуць яго на працу на паўштату ў Гарадскую культурна-асветную кансультацыю ў Беластоку як інструктара па арганізацыі культурнай працы ў глыбінцы. „Дзякуючы гэтаму можа арганізаваць свае сустрэчы з чытачамі ў „тэрэне"", — піша Тамаш Данілецкі з ІНП. — „Трэба дадаць, што ў час кожнай сустрэчы пільна сачылі за ім супрацоўнікі СБ, якія занатоўвалі ўсе яго выказванні, шукаючы антысацыялістычных акцэнтаў. Гэтыя сустрэчы дазвалялі, аднак, Яновічу на прапагандаванне культуры і беларускай мовы сярод жыхароў Беласточчыны, на чым яму найбольш залежала". Здарылася, аднак, і так, аб чым успамінае Сакрат Яновіч, што ў час аднаго з арганізаваных кансультацыяй вечароў у рамках Беластоцкіх культурных сустрэч, стоячы „на брамцы", не ўпусціў ён цэнзара. На тыя мерапрыемствы прыходзілі людзі выключна па запрашэннях; у цэнзара такога не было:

— Я яму сказаў, што калі не пакажа мне запрашэння, мяне шэфіха выкіне з працы.

„Незалежна ад гэтых прычэпак, СБ рашыла працягваць аператыўныя дзеянні ў адносінах да яго, у апасцы ад яго „нацыяналістычнага" ўплыву на моладзь і актыў БГКТ. Паддалі пастаяннаму кантролю змест усіх яго публікацый, правяралі „ці не будзе намерваццa ці ўтрымліваць асабістыя і карэспандэнцыйныя кантакты з іншаземцамі капіталістычных краін з мэтай іх выкарыстання для кантрабанды варожых публікацый і пасквіляў за мяжу". Каля двух гадоў пераглядалі ўсю ягоную карэспандэнцыю і падслухоўвалі ўсе тэлефонныя размовы, маючы на ўвазе яго кантакты з Юрыем Геніюшам", — піша Данілецкі.

Раней згаданая Ларыса Геніюш (паэтэса, якая стала пасрэдніцай у перадачы ліста Яновіча Карпюку) успамінала мужа — Яна, ураджэнца Крынак: „Ён першы даў мне нашы кнігі, адкрыў мне вочы на наша мінулае і крыўду, якую мы выцерпелі на роднай зямлі. Чытаў мне Купалу".

У той час, калі на пачатку сямідзесятых Сакрат Яновіч жыве ў бядзе і пад наглядам у выніку даносу на яго, Аляксандр Амільяновіч ходзіць у лаўрах трыумфатара. Аляксей Карпюк застаецца ў Беларусі без працы. У 1972 г. выкінулі яго з КППС. Пасля было крыху лягчэй: „Але віжаванне за Карпюком працягвалася. Як кажуць сведкі тых падзей, не было якога-небудзь сходу Саюза пісьменнікаў, у час якога не выступіў бы Карпюк і не „ўрэзаў бы якому асвінеламу глаўначпупсу партыйнаму ці літаратурнаму", — пішуць Галіна Кацуба і Алег Дзярновіч. Калі абодва — Карпюк у Гродне і Яновіч у Беластоку падвяргаюцца „спробам" партыйных і спецыяльных служб, у сталіцы Гродзеншчыны летам 1972 г. праводзіцца дэманстрацыя моладзі пад лозунгамі „Свабоды слова", „Свабоды друку", „Свабоды любові". Прыняла ў ёй удзел моладзь з Мінска, Украіны, Латвіі і Расіі. Дэманстрацыю разагналі пры ўдзеле арміі. У Польшчы чарговыя шэдэўры піша Аляксандр Амільяновіч: „Stalowy szlak" і „Mafia". Праз гады Сакрат Яновіч піша (спасылаецца на гэта цяпер ІНП):

— Калі б я мог павярнуць час, то павярнуў бы перш за ўсё знаёмства з Аляксандрам Амільяновічам, бо на маім жыцці адціснуўся ён вельмі блага (...). Тады здавалася мне, што Амільяновіч гэта такая свіння, праз даносы якое пазбавілі мяне працы. Сёння ўжо ведаю, што тое свінства мела і мае грамадскі фактар. А гэта ўжо не толькі справа адно Амільяновіча.

Аляксандр Амільяновіч цяжка хворы. Адпусцілі яго на тры месяцы з турмы. Абяцаў, аднак, пасля рэабілітацыі, праз нейкі месяц, сустрэцца з „Нівай" і апавесці сваю версію падзей. Ці стрымае слова? Калі так, ці можам яму паверыць?

Раіна Стэфанчук

Ніва 5

Вось такія былі пачаткі „Нівы”

- 6 -

Размова з Георгіем ВАЛКАВЫЦКІМ.

— Выбіраючы загаловак „Ніва”, Вы спасылаліся на...

— Несумненна, на „Нашу Ніву”. Сягнуў я да традыцыі, і каб было зразумела, не толькі для беларусаў, але і для палякаў — для распаўсюджвальнікаў, для пісьманосцаў. Я спачатку нават і думаў, ці не назваць яе „Нашай нівай”, але ці мы мелі права назваць гэтак. Я нашу ролю бачыў такую, як і „Нашай нівы” — яна, першая, адзіная беларуская тут у Польшчы, і заданне тое самае: гуртаваць, аб’ядноўваць людзей; Колас, Купала, іншыя нашаніўцы. І ў нас тое асяроддзе літаратурнае створана пры газеце.

— Перш за ўсё прамаўлялі вершы. Адтуль і публіцыстычныя — першы верш пра з’езд Матэйчука, вершы пані Веры Леўчук...

— Вера была адзіная, якая закончыла беларускі ліцэй, бо мы былі ўсе самавукі; зараз перастала вершы пісаць, занялася больш сур’ёзнай публіцыстыкай; была трыбунам беларускасці (тут уключаецца Вера Леўчук-Валкавыцкая: — А яшчэ Зося была!). Зося Бусловіч не займалася публіцыстыкай. У нас спачатку былі два штаты перакладчыкаў: на адным Зося, на другім Сакрат. Дарэчы, калі Яновіч перайшоў на штат журналіста, займаўся гаспадарчымі тэмамі. Мы ж спачатку не ведалі, што з яго вырасце пісьменнік. Нават у 1958 г., калі стваралася літаб’яднанне, ён сціпленька сядзеў пад акном (дарэчы, кожны мог прыйсці на ўстаноўчы з’езд літаб’яднання, паявіліся нават нейкія асобы з маладзёжных арганізацый). Яновіч у той час уздымаў нашу гаспадарку, заахвочваў да засноўвання кааператываў...

— Вы шукалі людзей, якія ведалі мову, журналістаў з усіх бакоў. Распытвалі ў іншых рэдакцыях... Падбіралі самі, ужо не па прапанаваным спіску.

— У рэдакцыю прыходзілі людзі, якія „ведалі мову”, закончыўшы клас ці другі беларускай школы, або не ведалі, што такое рэдакцыя. Запрапанавала мне рэдактарка „Жыцця Беластоцкага” (дадатак-старонка да „Жыцця Варшавы”) Крыстына Маршалак аднаго свайго добрага карэспандэнта з Сакольшчыны, які працаваў білецёрам у кінатэатры „Pokój”. Казала, што можам мець з яго толк. Сустрэўся з ім, аказалася, беларускую мову ведае, католік. Гэта быў Юзэф Рыбінскі...

— Як з’явіўся Аляксандр Амільяновіч?

— Ён быў у Кашаліне, працаваў у аддзеле лістоў. У аддзеле лістоў не мусілі працаваць журналісты. Амільяновіч перабраўся ў Беласток, і прыйшоў у „Беластоцкую газету” шукаць занятак. Яго накіравалі да нас, бо ведалі, што шукаем журналістаў. Узялі мы яго на аддзел лістоў. Мы, дарэчы, аддзел лістоў хутка ліквідавалі. Наступіла спецыялізацыя: Вера займалася культурай, Хмялеўскі сельскай гаспадаркай, грамадскімі справамі...

— Той першы склад рэдакцыі захоўваўся досыць доўга...

— Да 1963 г. Адышоў тады Рыбінскі, Амільяновіч.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— Аляксандр Амільяновіч досыць пільна трымаў у таямніцы свой ніўскі эпізод. Патрактаваў, таксама, здаецца, „адпраўку” ў „Беластоцкую газету” крыўдліва.

— Ён у нас хутка перайшоў быў на публіцыстыку, на аддзеле лістоў быў месяц ці два. Дарэчы, нам штатаў далі менш, чым мы планавалі, і старонак менш. Я нарабіў быў і кіраўнікоў. А ў кіраўніка якія абавязкі — за кіраўніцтва грошы былі, а кіраваць няма кім, да таго абавязку пісання няма. Я стаў надаваць нормы пісання, кіраўнічыя штаты паліквідаваў... А Амільяновіч з Рыбінскім пачалі былі ў нас фурор рабіць. Ездзілі яны па „тэрэне” на матацыклах. Людзі, аказалася, любяць тыя тэмы, якія яны краналі — вайну, прыгодніцкія гісторыі. Амільяновіч выпісаўся за некалькі гадоў. Стаў пісаць аб іншай тэрыторыі — пра Сувальшчыну, стаў рабіць новых герояў, публікаваўся ў іншых месцах. У „Ніву”, хоць на штаце быў, не прыносіў матэрыялу...

— Маю ўражанне, што ў Амільяновіча нейкія „zaszłości” з „Нівай” былі не толькі таму, што яго адправіла, мабыць, і на Вас нейкую крыўду меў, ну і на Сакрата Яновіча, які ягонымі тэкстамі займаўся, бо ж пасля вылілася гэта ў брудную гучную справу...

— Мы з ім і жылі блізка. Пад канец 1956 г. была магчымасць, каб памяшканне „Нівы” прызначыць на жыллё. Мы там з Верай атрымалі два пакоі, і Амільяновіч таксама, бо быў бяздомны. Як пачаў пісаць пра АКоўцаў, зразу яму і кватэру далі ў новым будаўніцтве, на Легіяновай, а мяне выклікалі ў Гарадскую раду, да старшыні Крахмальскага, каб вярнуў я тую адрамантаваную намі кватэру, дадуць мне кватэру па прафесары з Акадэміі. Я не пагадзіўся, бо ўклаў шмат у рамонт свае. Амільяновіч узяў. Скачуць над ім, а мяне пры ўсіх аблаялі: „My jemu zrobimy taki kołchoz, że on przyjdzie do nas na kolanach prosić...” А Амільяновіч зусім перастаў пісаць у „Ніву” — грошы бярэ, а друкуецца ў „Газеце”. Папрасіў я рэдактара Новака, каб узяў яго да сябе на штат, бо ў нас ужо вычарпаўся, але не хачу, каб гэта ад мяне выходзіла. Добра, кажа. Раз-два, звольніўся ў іх штат, і ён узяў Амільяновіча. Два дні пасля Васіль Баршчэўскі, які ў нас быў парторгам (шэфам партыйнай ячэйкі), і сябрам Амільяновіча, убег у рэдакцыю і крычыць: „Жыве Беларусь!” — „Ты што, здурэў?” — „Што, выгналі Амільяновіча?! Палякі непатрэбны нам?!” Амільяновіч з таго часу не наведаў нас, нават не заглянуў у рэдакцыю.

— Усё ж, не зусім пакончыў ён з „ніўцамі” ды беларускімі справамі (на гэтую тэму чытаем мы ў іншым артыкуле)... А ў „Ніве” пачалі паяўляцца новыя твары, ужо не „самавукі”...

— Закончыў школу ў Мінску Мікола Гайдук, паявіліся Яніна і Пятро Чэрнякевічы, людзі то па геаграфіі, то па філалогіі, раней Міхась Кураш (доўга не быў, хутка ўцёк, так як і спачатку Гайдук, які пайшоў быў у асвету). Ніхто нікога не выкідаў...

— У Вас, як калісьці заўважыла Ада Чачуга, заўсёды захаваўся сантымент да паэтаў... Дарэчы, як і ўва ўсіх беларусаў. Памятаеце дэбюты нават і тых, хто прамільгнуў на старонках адным-двума добрымі творамі.

— Памятаю першы верш Аляксандра Баршчэўскага (не Алеся Барскага, а яго дваюраднага брата з Бандароў), Дварэцкі з-пад Гданьска прысылаў, з Беластока пару паэтаў было, Беразаўцы Андрэй і Янка (адзін з іх бацюшкам цяпер, выйграў у нас нават ровар ва ўзнагароду), Віктар Рудчык, Станіслаў Вагурка (Дзядзька Лявонь)...

— Як рэкламавалі Вы „Ніву”?

— Мы ўтрымлівалі кантакты з „Рухам”, з поштай. Рабілі з’езды пісьманосцаў, давалі ўзнагароды для найлепшага пісьманосца. Мелі мы сваіх кіраўнікоў на пошце, вось у Гайнаўцы кіраўніком пошты быў Суліма, актывіст Таварыства, загадчыкам пісьманосцаў Эдмунд Вайсковіч, таксама наш карэспандэнт. У Гайнаўскім павеце мы па падпісцы былі на першым месцы сярод усіх газет. У Бельскім павеце таксама было няблага. А прыярытэтам былі партыйныя газеты. З Сакольшчыны мы мелі таксама шчырых распаўсюджвальнікаў ды карэспандэнтаў, ды пісалі яны пад псеўданімам — Сульвэстар ці Сук, Гандзя. Яны спаборнічалі не так за ўзнагароды, а як першае месца здабыць...

(працяг будзе)

Размаўляла Міра Лукша

Кулік

Дзень марозны. Снег пушысты.
Звоніць бомаў гулкі звон.
Мае коні, коні - іскры
Мчацца з ветрам наўзагон.

Коні, жвавей! Коні, жвава,
Рыпе сталаю пухкі снег,
Там мая чакае міла,
Мая міла — маку цвет.

Коні сталі. Коні спалі...
Зноўк срэбрысты бомаў звон.
На марозе ў белым шалі
Ты шапчала: «Гэта-ж ён!»

Правісу праз сумёты,
Каб твой бошік не абмок;
Не шанчы мне: «хто ты, што ты...
Вунь суседчын хітры зрок...»

Што суседкі мне, дзяўчына.
Нічаком нам іхні суд —
Тае кусны, як маліна
Чорны бровы — існы цуд.

Правішім мы ў санках гонкіх
Цераз вёску куліком
І зазвоніць смех твой звонкі
Першым веснім жаўруком.

Будзем дзёпць аж да зоркі
Хай не змяшча нам ся злом.
А ў мяцеліцы, мабыць, «торкаі»
Гукне дружка за сталом.

Міка

Ніва 3

Мікола Гайдук (Міка) дэбютаваў у „Ніве” вершам у 1958 годзе

Жыццё бярэ сваё і многія рэгіёны самі па сабе пачынаюць усведамляць уласную асаблівасць, нягледзячы на існуючае адміністрацыйнае дзяленне...

http://sumiezza.org

Сёння Беларусь падзяляецца на шэсць абласцей і Мінск, як асобную тэрытарыяльна-адміністрацыйную адзінку. Такое дзяленне перайшло сучаснай суверэннай дзяржаве ў спадчыну ад часоў знаходжання яе ў складзе Савецкага Саюза. Часы цякуць, многае мяняецца, але пакуль нават у тэрытарыяльна-адміністрацыйным плане Беларусь застаецца ў складзе неіснуючай дзяржавы. Бо менавіта з пункту гледжання маскоўскіх начальнікаў яна была падзелена на такія вялікія для беларускай краіны вобласці. У постперабудовачныя часы прасоўваліся ідэі павелічэння колькасці тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак коштам іх драбнення, але яны засталіся незрэалізаванымі з-за ментальнага вяртання беларусаў у СССР. Аднак жыццё бярэ сваё і многія рэгіёны самі па сабе пачынаюць усведамляць уласную асаблівасць, нягледзячы на існуючае дзяленне. Праяўляецца гэта, між іншым, у Інтэрнэт-прасторы, а менавіта на сайтах, якія распавядаюць пра жыццё адразу некалькіх раёнаў той ці іншай беларускай вобласці. Для прыкладу сайт, які месціцца па адрасе: http://sumiezza.org.

Калі мы зойдзем на першую старонку сайта, што называецца „Сумежжа: Глыбокае, Паставы, Докшыцы, Мёры, Браслаў, Шаркаўшчына", то перад нашымі вачыма з'явіцца даволі прывабнае выяўленне, складзенае з традыцыйных трох частак. Уверсе старонкі месцяцца выявы цэркваў і касцёлаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі, што прылягае да граніцы з Літвой. Пэўна з таго і назва сайта. Дарэчы, усе адзначаныя мясціны знаходзяцца ў складзе Віцебскай вобласці і носяць неафіцыйную геаграфічную назву Паазер'е. „Сумежжа — гэта вольныя навіны, кнігі, здымкі паўночнага захаду Беларусі, — пішуць распрацоўшчыкі сайта. — З гэтага году ў нас працуе фотагалерэя рэгіёну, куды вы можаце дасылаць свае здымкі. Давайце разам пашыраць вядомасьць Паазер'я. Рэгіструйцеся ў нас на сайце, дасылайце нам свае навіны, здымкі, ідэі. Шчасьця і посьпехаў вам, сябры, у Новым годзе!". Далей на галоўнай старонцы падаюцца навіны з даных мясцінаў і банэр сайта адзінага прэтэндэнта ад дэмакратычных сіл на пасаду прэзідэнта — Аляксандра Мілінкевіча. Гэта ўсё пасярэдзіне, а з правага боку — выйсці да рубрык і ўваход для зарэгістраваных карыстальнікаў. Хто не зарэгістраваўся, можа тут жа гэта зрабіць, праўда, для чаго патрэбная даная рэгістрацыя, на сайце, на жаль, не распавядаецца.

Калі праглядзець рубрыкі, то падаецца, што распрацоўшчыкі не надта клапаціліся іх напаўненнем, згодна з уласнай заявай на першай старонцы. Гэта тычыцца, у першую чаргу, такой рубрыкі як „Спасылкі", дзе знаходзяцца выйсці на сайты, што маюць такія ж стасункі з Паазер'ем, як, напрыклад, з Вогненнай Зямлёй.

Пэўна, „Сумежжа" не вельмі добра распрацаваны сайт. Праўда, ён дае магчымасць стварыць у наведвальніка такое-сякое ўяўленне аб мястэчку Глыбокае. Менавіта фотаздымкі з гэтага горада размешчаны на сайце ў рубрыцы „Галерэя". Здымкаў даволі многа, але шмат з іх настолькі аматарскія, што не заўсёды перадаюць асаблівасці даных мясцін.

Нягледзячы на мноства хібаў і недапрацовак сайта, вялікім яго плюсам ёсць усведамленне натхняльнікамі і распрацоўшчыкамі адметнасцей сваёй малой радзімы ў кантэксце цэлай Беларусі і жаданнем распавесці пра гэта астатняму свету.

Уладзімір Лапцэвіч

У 1/16-й фіналу беларускі майстар па сетцы трапіў на першую ракетку свету — самога Ражэ Федэрэра...

Беларусь, беларусы...

Нашы ў краіне кенгуру

Трое беларускіх тэнісістаў узялі ўдзел у адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі. Па традыцыі „Australian Open" распачынае сезон турніраў так званага Вялікага шлема (акрамя першынства ў краіне кенгуру, у яго ўходзяць французскі Rolan Garros, адкрытыя чэмпіянаты ЗША і Вялікабрытаніі). У адзіночным разрадзе сёлета ў Мельбурне выступілі Максім Мірны (ён быў пасеяны пад трыццатым нумарам), а таксама Анастасія Якімава і Вікторыя Азаранка, якія былі змушаны прабівацца ў асноўную сетку праз сіта кваліфікацыі. Яшчэ двух беларусаў выбылі на папярэдняй стадыі. Тацяна Пучак спярша перамагла эстонскую тэнісістку, а ў другім крузе саступіла нямецкай. А Уладзімір Ваўчкоў адразу прайграў малавядомаму шведу. Гэты факт пацвердзіў найгоршыя прагнозы — апошнім часам Ваўчкоў на сур'ёзных турнірах выступае няўдала. А менавіта ў Аўстраліі ён дасягнуў хіба найвышэйшага выніку ў сваёй кар'еры. Так на сіднейскай алімпіядзе ў 2000 годзе Ваўчкоў заняў высокае чацвёртае месца. Змагацца ў чаканым матчы Кубка Дэвіса супраць Іспаніі (ён адбудзецца 10-12 лютага ў Мінску) будзе вельмі цяжка. Так у асноўную сетку чэмпіянату Аўстраліі трапіў ажно тузін іспанскіх тэнісістаў (з іх палова была пасеяна адразу). У беларусаў жа выбару няма.

Асабліва варта парадавацца за Вікторыю Азаранку, якая ўпершыню заявілася на турнір „Вялікага шлема". Летась Азаранка выйграла юніёрскі турнір „Australian Open", цяпер прабілася ў асноўную абойму. І гэта ў 16 год. Нічога, што яна прайграла зараз сеянай індыйцы Саны Мірза (6:7, 2:6) — сур'ёзныя вікторыі Вікі не за гарамі. Анастасія Якімава таксама саступіла ў першым крузе — чэшцы Ніколь Вайдзішавай (1:6, 3:6).

Галоўнай падзеяй турніру стала вяртанне на корт знакамітай швейцаркі Марціны Хінгіс, якая не выступала на прафесійным роўні некалькі год. Дарэчы, варта ўзгадаць што менавіта з Хінгіс пераможцай чэмпіянату Аўстраліі ў парным разрадзе станавілася наша Наташа Зверава — было гэта ў 1997 годзе. Гэта быў не адзіны поспех Зверавай на зялёным кантыненце — у 1994 годзе яна перамагала з амерыканкай Дж. Фернандэс, у 1995 годзе ў змешаным разрадзе з амерыканцам Р. Лічам, а ў 1999 годзе разам з Ліндсэй Дэвенпорт (якая выступае і дагэтуль) была другой. Зверава найбольш тытулаваная беларуская тэнісістка — разам з грузінкай Лэйлай Месхі яна была бронзавай прызёркай барселонскай алімпіяды ў пары. Завяршыўшы кар'еру, Наташа (менавіта так патрабуе яна называць сябе) пасялілася ў Берліне.

Максім Мірны ўжо па традыцыі заявіўся ў двух разрадах. У адзіночным ён прайшоў два кругі. Адолеўшы ў цяжкім пяцісетавым змаганні француза Цьеры Аск'ёна (6:3, 3:6, 6:1, 6:7, 6:0), наш „Галіяф" прайшоў таксама Давіда Сангінеці з Італіі — 3:1 (7:5, 6:3, 4:6, 7:6). А ў 1/16-й фіналу беларускі майстар па сетцы трапіў на першую ракетку свету — самога Ражэ Федэрэра. Не дзіва, што ў трох сетах выйграў швейцарскі тэнісіст — 6:3, 6:4, 6:3. Але каронкай Мірнага ёсць парны разрад. У гэтым годзе „Звер" (такая мянушка Максіма ў тэнісным свеце) разам са сваім сталым напарнікам шведам Юнасам Б'ёркманам ужо выйгралі турнір АТР у Катары. У Аўстраліі беларуска-шведская пара лічыцца адным з фаварытаў і ўжо прайшла тры стадыі.

Уладзімір Хільмановіч

Канспірацыя

Зміцер зайшоў да мяне без званка. Без званка, гэта яшчэ мякка сказана. Ён проста адчыніў дзверы нагой, перад гэтым добра размахнуўшыся. Улічваючы тое, што ён толькі што адсядзеў пятнаццаць сутак у астрозе за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу і ўваліўся да мяне ў невыносна дурным настроі, але з бутэлькай гарэлкі ў руках, я вырашыў прыняць удар нагой у дзверы за лёгкае пастукванне.

— Сёння маем права выпіць, — традыцыйна для такога настрою прывітаўся ён.

На мяне яго эфектны дазвол чаканага ўражання не зрабіў. Зміцер быў у цвярозым стане. Мой стан быў зусім адваротны ягонаму. Гэта па-другое. А па-першае, ужо гадоў дваццаць пяць, мне, каб выпіць, нічый дазвол не быў патрэбны.

— У мяне, пакуль я любаваўся небам праз краты, быў час для прыёму ў сваю булаву новых думак пра нашу бяздарную дзейнасць, — заявіў Зміцер, з абыякавасцю кінуўшы бутэльку на канапу, нібыта збіраўся з ёй спаць. — Мы, як тыя бараны, б'емся галавой усё ў тыя ж вароты, а сэнсу ніякага. Толькі выйдзем улёткі раздаць, а на нас скок міліцыя, як блохі на бяззубага сабаку. І ўлётак не паспяваем раздаць, і нас заграбаюць у каталажку. Не паспяваем нават мяўкнуць. А ў чым справа? — пытаю. І сам адказваю. Справа ў адсутнасці канспірацыі. Міліцыя заўсёды ведае дзе мы будзем збірацца, бо трэплем языкамі на кожным вугле, як бабы без работы. Больш ніякіх публічных абмеркаванняў нашай дзейнасці. Сабраліся пяць чалавек і ўсё вырашылі. Тады і ўлёткі раздаць паспеем, пакуль за намі міліцыя прыедзе, і ў дадатак яшчэ паўцякаем з месца злачынства. А там, шукай ветру ў полі. Дакажы, што мы былі. Пачнем дзейнічаць прама сёння. Няма чаго адкладваць у глыбокую скрыню. І ўлёткі ёсць, што на мінулую акцыю рабілі. Так і не раздалі яшчэ. Затое зараз усё пойдзе як па масле. Канспірацыя — гарантыя нашых перамог!

Я не стаў спрачацца. Бессэнсоўна. Як можна ў чым пераканаць апантанага. Толькі ўласны досвед, кінуўшы пару палак у колы, можа збіць такі імпэт. Ды і ў самога нейкая надзея з'явілася, што знойдзены залаты ключык ад усіх праблемаў. Вельмі хацелася ў гэта верыць, бо вельмі не хочацца пападацца ў лапы бугаёў у мундзірах. Таму і пагадзіўся з гэтымі высновамі. Толькі паспрабаваў неяк надаць такой сур'ёзнай размове трохі жартаўлівасці:

— Але ж як нас не будуць біць, саджаць і затрымліваць, то лік людзей у апазіцыі паменшыцца, — кажу. — Не будзе тады стымулу працаваць. А так дастанеш па плячах дубінай і зноў хочацца на мітынг, каб паглядзець чым кончыцца на гэты раз.

Ды гэты жарт Зміцерам не быў успрыняты належным чынам. Занадта быў настроены ён па-дзелавому, як кот на мышкаванні.

Праз колькі гадзін мы з ім і яшчэ тры чалавекі, павыключаўшы мабільныя тэлефоны, схаваўшыся ў бязлюдным лясным масіве, шэптам абмяркоўвалі месца правядзення чарговай акцыі. Паспрачаўшыся, як гэта прынята ў апазіцыянераў (хіба такая даўняя нацыянальная традыцыя), бо на пяць прысутных там чалавек было шэсць меркаванняў, у якім месцы горада зручней здзейсніць задуманае, і сем меркаванняў наконт часу правядзення, мы ўрэшце здолелі дамовіцца. Выйграў восьмы варыянт, які ніхто не прапаноўваў. Але ўсе цешыліся, што нічыя з нашых прапановаў не была прызнана разумнейшай за іншыя.

Назаўтра ў дамоўленым месцы і ў вызначаны час мы зноў спаткаліся, трымаючы за пазухай некалькі скручаных пакетаў з улёткамі. Праўда, двое з пяці не прыйшлі. Але гэта справа звыклая. Мала там што магло здарыцца. Бяда была не ў тым, а ў іншым. Вакол нас, як каты ля акварыума, соўгаліся нарады міліцыі. Акцыя была сарваная ад пачатку.

— Адкуль яны тут узяліся? — праз зубы выдушыў Зміцер. — Мы ж, здаецца, добра заканспіраваліся. Як атрымаўся такі пракол? Уцечка інфармацыі?!

— Ды ніякой уцечкі, — лянiва пазяхнуў Лявон, трэці хто з намі быў. — У гэтым месцы і ў гэты час іх заўсёды больш чым сабак на сметніку. Цэнтр горада ўсё ж. Работа ў іх такая, хадзіць туды-сюды. Вось і ходзяць.

— Сапраўды, міліцыі хоць адбаўляй. Толькі дастанеш улёткі, зразу замятуць у пастарунак. Акцыю прыйдзецца адкласці, — пачырванеў расчараваны аўтар тэорыі мясцовай канспірацыі. — Аднаго толькі не магу ўцяміць. А дзе нашы? Дзе апазіцыя? Каб нас было шмат, можа паспрабавалі б што зрабіць.

— А нашы пра акцыю нічога не ведаюць, — засмяяўся я. — У нас вельмі добрая канспірацыя, — і, пашкадаваўшы збянтэжанага Зміцера, дадаў: — Хадзем лепш да мяне. Там з учарашняга дня на канапе твая бутэлька валяецца, нікому непатрэбная, нібы ў ёй мёд. Там і паразмаўляем як канспіравацца на будучыню. Можа што і прыдумаем.

Генрых Западашмянскі

Маладыя не гаспадараць

Вёска Казлы ў пяці кіламетрах ад Бельска-Падляшскага, аднак гарадскіх уплываў у ёй занадта не відаць. Тут традыцыйная забудова без нейкіх новых выдумак. У зімовы дзень на вуліцы, якая ў вертыкальнай праекцыі нагадвае літару „L”, пуставата. Заходжу да солтыса.

Солтыс Васіль Купрыяновіч, якому ўжо за шэсцьдзесят, збіраецца акурат карміць свой дабытак. Раней, кажа, трымаў ён многа кароў, а цяпер толькі трое дойных і трое маладняку. Ды і гэта прыйдзецца прадаваць; малочныя квоты замалыя.

У вёсцы, па сутнасці, усе пенсіянеры. Маладыя ёсць, але не гаспадараць. Адзін малады зямлю мае і той нічога на ёй не робіць. Сёння вёска Казлы, у сельскагаспадарчым плане, амаль пустая. Пастаянна пражывае тут каля пяцідзесяці душ, дзяцей няма, маладыя раз’ехаліся ў Беласток, Бельск.

Калісь у Казлах было пяцьдзесят шасцярых гаспадароў, кожны трымаў па чатыры-пяць кароў, здавалі малако, гадавалі свіней. Яшчэ працуе пункт прыёму малака між Казламі і Рэйпічамі, які прымае сыравіну з трох вёсак: названых двух і Ляўкоў. Адна жанчына, што сама жыве ў Бельску, трымае тут трынаццаць кароў. І адзін пенсіянер апрацоўвае апісаную на сына зямлю.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вуліца ў Казлах

А крыху маладых, то такія гаспадары, што ім зямлю бацькі крыху абрабляюць. І калі не хочацца самім рабіць, то і гаспадарання не будзе, бо лёгка запусціць гаспадарку, але пасля вельмі складана яе адбудаваць. Шмат зямлі ранейшыя гаспадары аддалі дзяржаве за пенсію.

У Бельск, дзе лекар і ўсе ўстановы, дастацца складана. Калісь праз Казлы ездзіў аўтобус з Дубяжына. Цяпер солтысу ўдалося ўстанавіць прыпынак на кляшчэлеўскай шашы, да якой ад Казлоў трэба ісці каля кіламетра. Аўтобусныя білеты дарагаватыя і часам людзі ездзяць у Бельск на веласіпедзе, нават пакупкі аформіць. Бо хаця аўтакрамы завітваюць у Казлы штодзённа, нават па тры, аднак яны дарагія. Асабліва цяжка пажылым людзям менавіта зімою, калі дарогі або заснежаныя, або абледзянелыя. І мой суразмоўца пакульгвае пасля выезду ў такую дарогу роварам.

Аляксандр Вярбіцкі

Падзяка

Пасля таго, як „Ніва” н-р 1 за 2006 год змясціла мой невялікі допіс п.з. „Увекавечыць”, я прыняў каля дзесяці тэлефонаў з падзякай за тое, што ўзняў важную для нас, праваслаўных, справу. Тэлефанавалі мне людзі з блізкіх і далейшых мясцовасцей. Але найбольш мяне ўразіла падзяка і падказка аднаго чалавека, які, як пазней выявілася, з’яўляецца каталікам і прасіў застацца ананімным.

Сказаў ён мне, што ў справе ўвекавечання месца нараджэння пакойнага мітрапаліта Васілія трэба звярнуцца, перш за ўсё, да войта Нарваўскай гміны, ён напэўна дапаможа. У добраўпарадкаванні месца дапаможа праваслаўная моладзь згуртаваная ў брацтвах, што дзейнічаюць пры гарадскіх цэрквах. Моладзь трэба толькі заахвоціць да гэтай справы. А суседнія вёскі — Агароднікі і Такароўшчына — напэўна прымуць праваслаўную моладзь на начлег. Важнае, каб усё адбывалася пад наглядам войта.

Падумайце, іерархі Праваслаўнай царквы, і вясною паразумейцеся з войтам Нарваўскай гміны, каб як найхутчэй навесці парадак у Цісах. Няхай гэтая вёска стане вядомай усім праваслаўным вернікам і каб ніколі не загінула памяць пра пакойнага мітрапаліта Васілія.

Мікалай Лук’янюк

На скрыжаванні

Часта вечарам выбіраем з жонкай тэлеперадачы з Беларусі, якія перадаюцца на некалькіх каналах; некаторыя з іх прыёмнік адбірае вельмі чыста, іншыя — не надта, як праз туман. Большасць гутарак адбываецца там на расійскай мове, бо пражываючыя ў гарадах беларусы перайшлі на тую мову, так як у нас на польскую. Аднак па вёсках, асабліва ў тых, якія да вайны былі пад Польшчай, на нашу радасць гучыць наша беластоцка-бельска-гайнаўская гаворка. І вёскі там мо бяднейшыя, як і людзі, аднак задбаныя і рознае колішняе рукадзелле, напр. тканне на кроснах, вязанне на прутках, там не звялося і жанчыны, пераважна пажылыя, гэтым умела займаюцца. Не звяліся там таксама прыгожыя, цудоўныя песні, ад якіх аж сэрца шчыміць. І людзі там яшчэ апранаюцца ў такую фальклорную, саматужна выкананую адзежу; гэта ніякія ні грэх, ні ганьба. А ў нас ніхто — барані Божа — такога на сябе не апране і трэба паставіць пытанне: хто з гісторыяй і спадчынай вышэй стаіць — яны ці мы? Адказ: яны! І гэта мы павінны ад іх — бедных — многа чаму навучыцца.

Напэўна ў Беларусі жывуць бядней чым у нас, хаця і ў нас афіцыйна (бо неафіцыйна напэўна больш) звыш пяці мільёнаў людзей жывуць у нястачы; таму няма нам чым хваліцца і кагось павучаць. Мо павучаць, каб сваіх салдатаў нехта пасылаў у Ірак, бо гэта заманулася прэзідэнту Бушу! Лукашэнка супраць гэтага і яго зрабілі амаль разбойнікам. А ці ён дурнейшы ад нашых палітыкаў, бо не валодае англійскай ці нямецкай мовамі? Што ж: ён у сваёй крыві не мае нічога яўрэйскага, бо калісьці мой бацька часта паўтараў: калі вучаны чалавек ведае многа замежных моў, дык ён абавязкова яўрэй. Але бацька (так як і я) да жыдоў адносіўся з вялікай павагай і пашанай.

На Беларусі апранаюцца нічуць не горш, чым у нас і галодных там не відаць. Ці мы ў сапраўднасці іх так далёка абагналі? Тэлевізійныя перадачы адтуль намнога цікавейшыя за нашы, бо мы жуем усё адно, аж абрыдне слухаць. А калі пачне спяваць нейкі наш беларускі, украінскі ці літоўскі хор, дык абавязкова нейкі балбатун будзе гэтаму перашкаджаць і тлумачыць гледачу гісторыю гэтай песні; а навошта нам гэта?

А тое, што Аляксандр Лукашэнка гутарыць чыста па-руску, дык хто гэтаму вінаваты? Калі б усе людзі на Беларусі гутарылі чыста па-беларуску, дык і ён напэўна вёў бы размову на роднай мове; я ў гэтым упэўнены! Не ўсё там страчана, і, галоўнае: адраджаецца Хрыстова вера і беларуская мова не загіне; і мы да гэтага павінны больш прыкладаць сэрца і павагі і больш памагаць, а менш крытыкаваць. Чалавек прывык бачыць саломіну ў чужым воку, а ў сваім бервяна не заўважае; і гэта ўся бяда.

У параўнанні з царскай сённяшняя Беларусь з’яўляецца высокаразвітай краінай, бо вырабляе высакаякасныя машыны і прылады, не горшыя ад нашых, а нават ад амерыканскіх; прыклад, трактары „Беларусь”! Там лепш дбаюць аб жывой прыродзе каб яна не загінула. А ў нас дбаюць толькі на паперы — гладка, як па масле.

Мы, усе беларусы, павінны лепш глядзець мо на ўсход, чым на захад. Брыдка і ганебна слухаць, калі нейкі наш „патрыёт” кляймуе рускую мову (так як Пілсудскі ненавідзеў яе); маўляў: мне беларуская па душы. А не ведае бедны таго, што той, хто не любіць рускую мову, ён і беларускую за нішто мае. Бо мы славяне або не? Кожная мова гэта святасць і кожны народ — яе корань і начынне. Чалавек можа памыліцца а нават учыніць злачынства, але не народ. І на канец: якая літаратура можа зраўняцца з рускай літаратурай? Прашу мне адказаць!

Мікалай Панфілюк

Наш жэўжык

Мо на сам пачатак адкажу на драматычна пастаўленае спадаром Панфілюком апошняе пытанне. З рускай літаратурай можа зраўняцца літаратура жыдоўская. Чаму? Таму, што Пушкін — паводле новай дэфініцыі — быў яўрэем, бо ведаў французскую і лацінскую мовы ды, мабыць, і мову лонданскіх dandys’. Калі добра прыглянуцца ягонаму партрэту, дык можна яшчэ пабачыць і парасткі пэйсаў.

Я вельмі спачуваю спадару Панфілюку, бо любімая ім літаратура можа зусім высахнуць у выніку адукацыйных працэсаў, якія як бервяно ў нашым тутэйшым воку. Спадзяюся, што ў сваім тэлевізары ён бачыць толькі саломінку ў чужым.

Часта ў сваіх допісах спадар Панфілюк згадвае, як ягоныя сямейнікі паверылі прапагандзе, якою манілі з усходу. Сёння спадар Панфілюк зачараваны высокаразвітай у параўнанні з царскай Беларуссю сучаснай Беларуссю і трэба толькі спадзявацца тае бяды, калі ён з’едзе ад нас у сучасны рай (славяне, жывая прырода, Хрыстова вера, цудоўныя песні і г.д.), пакідаючы нас у тым горы, дзе гладка дбаюць пра нас толькі на паперы.

Некаторыя нашы чытачы, бывае, выказваюць незадавальненне прыхільнасцю нашай рэдакцыі да спадара Панфілюка. Прызнаюся, што гэтая прыхільнасць пачынаецца ў мяне, бо я апрацоўваю ягоныя допісы і большасці з іх даю далейшы ход; некаторым з іх таго ходу не дае рэдакцыя. Хацеў я адкласці і гэты тэкст, але пашкадаваў. Бо менавіта тут аўтар паказаў сваю незвычайную адметнасць, якая праяўляецца небывалай светагляднай мабільнасцю. Сталы чалавек мае ўжо нейкі свой пастаянны пункт гледжання, а спадар Панфілюк ганяецца па розных аспектах, як жэўжык у кароткіх нагавічках. Ці не цікава часам паглядзець такі спорт?

Аляксандр Вярбіцкі

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 700 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп’ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2006 r. upływa 5 marca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Дзе вы?

— Дзе вы? Што робіце вы, Беларусі сыны?

— П'ем, залажыўшы сумленне ў ламбард Сатаны.

— А ці яшчэ вы не ўсё, што ільга, прапілі?

— Не! Дапіваем яшчэ. Вось — ізноў налілі.

— Дзіўна! Па-мойму, вы ўсё прасцулячылі ўжо!

— Не! У запасе — барыш ад прадажы крыжоў.

— Тых, што на храмах? Што нам сцерагуць небасхіл?

— Тыя пасля. Напачатку — з дзядоўскіх магіл.

Ніл Гілевіч, 1996

Народ, куды ты ідзеш…

Цяпер ужо ніхто не скрывае, што ў нашай краіне людзі співаюцца. Дасюль Бог мілаваў такой долі многім беларускім вёскам на Беласточчыне. Але цяпер, хіба, прыйшла чарга і на нашых вяскоўцаў хлябнуць горкай. Аб іх ужо здаўна вядзецца гаворка аб тым, як яны падаюць у бездань алкагалізму. Але ад самой гаворкі сітуацыя ў лепшы бок не мяняецца. Мала таго, як паказвае статыстыка, п'янства з кожным годам пашыраецца. Што застаўляе людзей штораз часцей заглядаць у бутэльку?

Наглядаў я не раз, што дзеецца ў вясковых і гарадскіх магазінах, вакол іх і ў хмызняках. П'янтосы, як правіла, п'юць чарніла, дэнатурат ці адэкалон, а за закуску маюць пячэнне або папяросы. Згаданы набор алкаголю не такі ўжо і дарагі і менавіта таму разам з півам карыстаецца ён найбольшай папулярнасцю ў магазінах і на базарах. Мора піва выпівае таксама школьная моладзь, не адстаюць ад іх і пенсіянеры. Здаўна вядома, што чым больш народ вып'е гэтай гары, тым лягчэй уладам утрымаць, напрыклад, школы, шпіталі і т.п.

Калісьці так многа не пілі і людзям спакайней жылося. Не было такога зладзейства і хуліганства, такіх разбояў як сёння. Як страшна мяняецца наша жыццё! Хачу сказаць, што пры маёй маладосці так многа людзі не пілі таму, мабыць, што не было на гэта часу. Усе тады мелі работу, былі заняты ёю.

Сёння па вёсках многа старых кавалераў, якія не думаюць як ажаніцца, толькі п'юць, як гэта гаворыцца, для падтрымання нагавіц. І як тут не піць старым кавалерам, калі ім наканавана гараваць і дажываць на бесперспектыўнай вёсцы. Большасць часта п'е без прычыны. На вёсцы так заведзена, што за кожную паслугу трэба расплачвацца гарэлкай або абедам. У многіх дамах жывуць цяпер адзінокія, якія за кожную, нават самую дробную дапамогу, аддзячваюць бутэлькай.

Мужыкі, якіх жонкі прагналі з хаты за п'янства і здзек над сям'ёй, часта гуртуюцца і ўцягваюць у сваю кампанію безабаронную моладзь. А лік людзей залежных ад алкаголю з кожным годам расце. Куды гэты народ імкнецца? Пій, браток, пій, на старасць торба і кій — гаворыць народная прымаўка.

Віктар Бура

0-85 на сувязі з 0-61

Фота ПІЛІПА СПРЫНГЕРА

Беларусы не давалі такога чаду ў Познані ўжо даўно, а некаторыя нават сцвярджалі, што яшчэ ніколі. 16 студзеня, з нагоды Дня Салідарнасці, на запрашэнне Беларускага культурна-асветніцкага цэнтра і Незалежнага студэнцкага звязу зайграў „Zero-85"- (www.zero-85.pl). Культавая рок-капэла з Падляшша выступіла адразу пасля маніфестацыі, якая перад гэтым прайшла на пляцы імя Адама Міцкевіча. Месцам канцэрта стаўся клуб „Даблінэр Айрыш Паб", што месціцца ў старых мурах кесарскага замка ў самым сэрцы Познані, код якога — 0-61. „Сенька" — харызматычны вакаліст гурту, рэкамендуючы сябе публіцы, сціпла сказаў: „Прывітанне, наша група завецца „0-85", нашы песні па-беларуску і мы зараз заспяваем некалькі з іх". З самай першай ноты гурт проста электрызаваў сваім цяжкім гучаннем і несустраканым галасішчам свайго лідэра. Запоўніўшы ўсе месцы ў клубе, слухачы былі здзіўлены патэнцыялам арт-рокавага стылю, у якім жорсткія гітары ўмела і ўдала спалучаныя з амаль што з фальклорнай школай спявання. Асабліва прыемна былі здзіўленыя госці з Іспаніі, якіх „0-85" здолеў зацікавіць беларускім рокам. Яшчэ раз пацвердзілася правіла, што калі людзі адданыя музыцы цэлым сэрцам, то ўся іхная энергія перадаецца ўдзячным слухачам. Калі пасля звышгадзіннага выступу ажыўленая публіка дамагалася бісу, „Сенька" пажартаваў: „Вось мы сядзем, адпачнем і зараз яшчэ нешта прыдумаем". Пасля кароткага перапынку гурт выйшаў, каб заспяваць асабліва ўпадабаныя познаньскай публікай такія гіты, як „Страчана Ітака", ці „Чуфут Кале" на словы Уладзіміра Караткевіча, пад якія фаны ўчынілі шалёнае пога перад сцэнай. Падчас канцэрта прэзентавалася новая песня, прысвечаная памяці выдатнага, памерлага летась паэта Анатоля Сыса. Гурт пакінуў па сабе выключна добрыя ўражанні і выклікаў станоўчыя каментарыі новых фанаў, якія ўжо адразу па заканчэнні дамагаліся наступных канцэртаў і доўгачаканага альбома.

Віталь Воранаў



Адгаданка

1. Слабіцельны алей з насення клешчавіны (*Ricinus communis*), 2. частка конскай вупражы, якая змацоўвае аглоблі з хамутом, 3. сыравіна для смятаны, тварагу, сыру, 4. муж княгіні, 5. гомельская рака, 6. пахучае рэчыва са стручкоў ванілі, 7. сыравіна для керамічнай вытворчасці, 8. скамянелая смала жоўтага колеру для вырабу розных аздоб, 9. вадзяны вал ад гайдання паверхні вады, 10. адміністрацыйны цэнтр заходнесібірскай вобласці, багатай паліўнай сыравінай, 11. пяты месяц. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — прыказка.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 51 нумара

ААН, бацька, дзень, злосць, неба, поўсць, Руцкі, рэч, уцеха, хата.

Рашэнне: **Дзеці не хочуць слухаць бацькоў каб зарана не пастарэць.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Валянціне Марціновіч** з Краснага Сяла і **Мікалаю Раманчуку** з Гайнаўкі.

29.01 – 04.02

Баран (20.03. — 19.04.) Удалыя сустрэчы з людзьмі. Асабліва дасканалы час на рамантычныя спатканні. Спрыяюць табе Марс і Венера, вялікая ахвота на незямныя проста жарсці ды каханне.

Бык (20.04. — 20.05.) Усё ідзе складна і сарганізавана. Гэта апошнія дні, калі табе ўсё ідзе як па масле. Магчымасць нанова закахацца ў сваёй старой пары. Будзь асцярожны са сваімі касцьмі.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Не вельмі лёгка дагаварыцца з людзьмі і звычайна з імі кантактавацца. У рэалізацыі добрых ідэй могуць памагчы вам сябры. Зважайце на сваю пячонку.

Рак (22.06. — 22.07.) Калі маеш грошы, можаш іх шчасліва памясціць. Дамы Ракі можа хтосьці захапіць са знакамітымі манерамі ды пачуццём гумару. Нядаўні сябра можа спрабаваць табе зашкодзіць.

Леў (23.07. — 22.08.) Тыдзень крышку горшы. Цяжка будзе справіцца нават з празаічнымі заданнямі. Клопаты з грашыма. Пакахай сябе, лягчэй будзеш дарыць людзям каханне.

Дзева (23.08. — 22.09.) Важныя рашэнні пакінь на пазней. Не паддавайся буйнай фантазіі, бо на шчаслівыя выпадкі няма што разлічваць. Новы раман можа прадказваць штосьці файнае, ды на абяцанкі не разлічвай.

Шалі (23.09. — 22.10.) Шалёныя сустрэчы! Будзеце вельмі дасціпныя, інтэлігентныя ў кампаніі, тэмпераментныя. Мураванае захапленне атачэння. Ды хтосьці блізкі можа вас моцна параніць.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Мноства знакамітых ідэй. Можаш падзяліцца імі з іншымі — і яны добра на гэтым выйдуць. Сварлівасць, бескампраміснасць; прытармазі, бо гэта пашкодзіць і ў сям'і, і на працы.

Стралец (22.11. — 21.12.) Будзь асцярожны, старайся канцэнтравацца, каб цябе не ашукалі. Кароткія падарожжы. Можа нарадзіцца адно з найфайнейшых тваіх сяброўстваў.

Казярог (22.12. — 19.01.) Стома, уражанне, што з цябе выйшла паветра як з шарыка. Адпачывай, не бяры на сябе зашмат абавязкаў. Рэалізацыю найлепшых ідэй можаш планаваць на 29.01. Можаш пазнаёміцца з чужаземцамі; гэта знаёмства паможа даведацца шмат аб жыцці, будзе допінгам.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Сонца і Меркурый уваходзяць у твой знак. Набярэшся самаўпэўненасці, востра рушыш наперад з новымі знакамітымі ідэямі. Венера палагодзіць усе канфлікты. Прапанова працы-цікавінкі можа аказацца знакамітым інтарэсам.

Рыбы (19.02. — 19.03.) Усё далей хочацца вам весці нерэальныя планы. Пакуль што адпусціце — праз пару дзён можаце рушыць з рэалізацыяй ідэй. Але без прыгожых мараў няма прыгожых дзеянняў… Сяброўства Рыбы-мужчыны можа перамяніцца ў каханне. Усё ж, старайцеся не блытаць кахання з сяброўствам. Паправа атмасферы ў фірме. Могуць паказацца прыкметы незалечанай хранічнай хваробы, можаце быць неспакойныя.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960

Ніва
ПРА ГІСТОРЫЮ

1831 год: губернатар Мураўёў і соцкі Яновіч

У рускай гістарыяграфіі Лістападаўскае паўстанне 1830 года вядомае як „польская вайна 1831 года", што трэба разумець... як польская агрэсія супраць Расіі — у польскім разуменні першай паловы XIX ст. Польшча была тым самым, чым Рэч Паспалітая ў межах 1772 года, а Расія была zaborcą, але ў рускім разуменні Польшча была тым, чым Каралеўства Польскае ў межах 1815 года, а Гродзенская губерня разам з Беластокам была ўжо Расія, для таго польскія экспедыцыі вясной 1831 года на Валынь і на Вільню ўспрымаліся як „агрэсія".

Калі корпус Гелгуда быў адкінуты ад Вільні, і руская армія князя Паскевіча пайшла браць Варшаву, малады гродзенскі губернатар Міхаіл Мікалаевіч Мураўёў усталяваў па ўсёй даверанай губерні „земскую (сялянскую) дапаможную паліцыю", якая мела садзейнічаць рускай арміі і паліцыі... у аблавах і канвоях польскіх мяцежнікаў, альбо „сваіх уласных паноў". Так склалася своеасаблівае двоеўладдзе, бо шляхецкіх прывілеяў і мужыцкіх паншчынных абавязкаў ніхто не адмяняў, але ваеннае становішча давала губернатарам неабмежаваныя паўнамоцтвы.

Колішняе каралеўскае мястэчка Крынкі з канца напалеонаўскіх войнаў было прыўлашчана з дапамогай фіктыўных дакументаў і паліцэйска-вайсковай сілы высокага рангу расійскім дыпламатам і сенатарам з нямецкім прозвішчам фон Дзіваў — і бязбожна варагавала з гэтым рускім немцам і яго нашчадкамі, дастаткова сказаць, што суды, скаргі, бунты і новыя скаргі з удзелам Сената, вялікага князя і намесніка ў Каралеўстве Польскім, а нават цара Мікалая I „об отыскании крестьянами местечка Кринки мещанских прав" цягнуліся з 1820 да 1874 года!

І адзіны прасвет і палёгку мелі Крынкі ад сваіх рускіх, польскіх і нямецкіх паноў і аканомаў толькі ў 1831-1836 гадах, калі губернатарам у Гродне быў М. Мураўёў, будучы „Вешатель", а соцкім у Крынках — Лукаш Яновіч, даўні мяшчанскі продак класіка польскай і беларускай літаратуры Сакрата Яновіча...

„Земская дапаможная паліцыя" ў Крынках пад началам соцкага Лукаша Яновіча і дзясяцкіх Пятра Жамойды, Аляксандра Вярбіцкага, Іосіфа Заспіча і Міхала Анісімовіча спраўна спаўняла службу цэлы год (!), пакуль весенню 1832 года не прыехаў з Санкт-Пецярбурга сенатар фон Дзіваў і не даручыў аканому на Крынках пану Шыманскаму аднавіць „старыя дамураўёўскія парадкі", альбо загнаць соцкага Яновіча, чатырох дзясяцкіх і ўсіх паліцаяў, разам з сямейнікамі, назад на поўную паншчыну — згодна з маёнткавым інвентаром і яшчэ болей.

Соцкі Яновіч і чатырох дзясяцкіх, хоць і лічыў іх сенатар фон Дзіваў сваімі рабамі, самі ўважалі сябе мяшчанамі і збіраліся змагацца да канца перамогі, а паколькі былі яны людзі пісьменныя, то падалі скаргу на фон Дзівава і аканома Шыманскага самому губернатару Мураўёву.

У скарзе Яновіч і дзясяцкія пісалі, што сенатар абавязаў іх хадзіць на паншчыну, хоць „раней на паншчыну соцкія і дзясяцкія ніколі (!) не хадзілі", што гайдукі аканома Шыманскага сілай адбіраюць па хатах інвентар, скаціну, нават адзенне і не вяртаюць іх „дапаможнай паліцыі", пакуль усе паліцаі не стануць на панскі двор для работы, а праз такі гвалт і прымус ніхто не пільнуе чужых на дарогах, не ходзіць на варты ў пастарунак і нават не разводзіць на пастой „воинские команды".

У губернскай адміністрацыі ў Гродне аканом Шыманскі меў свайго чалавека і своечасова падаў сваю скаргу на ўсю „земскую дапаможную паліцыю" ў Крынках, маўляў, на паншчыну цягнуць не соцкіх і дзясяцкіх, а толькі іх сваякоў, пры гэтым адных мужчынаў, а самі паліцаі маюць абавязкаў няшмат, і ўвесь вольны час пускаюць на розныя стороннія заробкі, а сваімі правамі і паўнамоцтвамі злоўжываюць, ад чаго церпяць не толькі жыды, але тых жа паліцаяў суседзі і ўсе праезджыя па дарогах.

У студзені 1833 года абедзве гэтыя скаргі ляглі на стол губернатара М. Мураўёва, той перакінуў іх у Гродзенскі земскі суд, адкуль разбірацца ў Крынкі паехаў памочнік гродзенскага пракурора пан Нержынскі. Так у „справу Яновіча" ўцягнуліся адзін сенатар, адзін губернатар і двух „нашых польскіх паноў" на рускай службе... І ўсё з-за таго, што захацелі беларусы хадзіць „рукі ў брукі, кол у рукі" ў паліцыі, а не хадзіць на панскі двор да работы! Пра тую скаргу неяк забылася, бо важней быў гонар мундура...

— У Крынках апорны пункт дапаможнай паліцыі, — пісаў у рапарце Нержынскі, ясная справа, апісваючы не так „гістарычную праўду", як праекты свайго шэфа М. Мураўёва. — Таксама прымаецца і перасылаецца фельд'егерская пошта. Арыштанцкая. Напагатове конная сувязь і фурманкі для транспарту арыштаваных у Гродна. Парадак на кірмашах. А самае галоўнае, „местные десятские и сотские ловчее других примечать могут вновь прибывших", так што без Яновіча з яго дзясяцкімі руская паліцыя ўсяго Гродзенскага павета „останется без успеха в делах" у аблавах і ловах на разбітых польскіх мяцежнікаў. А таму памочнік пракурора Нержынскі браў цалкам пад абарону ўсю паліцыю ў Крынках і рэкамендаваў Гродзенскаму суду „учинить надлежащее представление, куда следует".

Аканом Шыманскі не здаваўся — у судзе ў яго таксама былі свае людзі, і аканом усё ведаў — ад яго пайшла скарга да павятовага маршалка шляхты, самога графа Солтана, прыяцеля князя Адама Чартарыйскага і пакойнага імператара Аляксандра I. У Расійскай імперыі „вольности дворянства" з 1785 года давалі шляхецкаму выбарнаму самакіраванню ў паветах і губернях своеасаблівае права veto — ніводзін шляхціч не мог быць да нічога прымушаны ні губернатарам, ні судом без згоды свайго маршалка ці ўсяе павятовай шляхецкай зборні, а propos, гэтыя „вольности" 1785 года ўрэшце развалілі Расійскую імперыю, як раней liberum veto разваліла Рэч Паспалітую Абодвух Народаў... Граф Солтан, ясная справа, стаў на бок сенатара фон Дзівава і падаў апеляцыю. Ізноў абедз-

[працяг ☞ II]

1863: Оскар Авейдэ і Каліноўскі

У жніўні 1863 года віленская паліцыя затрымала і перадала ў рускую контрразведку нейкага мешчаніна з Варшавы, немца Людвіга Шмідта. Быў ён западазроны ў тым, што „выдаёт себя за другого" — спачатку пасяліўся ў адным з лепшых гатэляў, дзе не кожны шляхціч з Віленскай губерні мог сабе дазволіць, потым наняў асобную кватэру... і слугу чысціць вопратку і абутак ды гатаваць каву, абедаў у рэстаранах, за тры тыдні пражыў 90 руб. са 150 руб., якія меў, прытым нібыта „шукаў месца бухгалтара ці памочніка ў краме", а за такую службу ў Вільні плацілі ў месяц 20 руб., калі ў Варшаве 40 руб. і болей etc, etc. Але Людвіг Шмідт упарта стаяў на сваім, нават калі яго прыперлі фактамі, што сапраўдны Л. Шмідт, аптэкар з Гродна, даўно ідзе па этапу ў Сібір, а сын таго Шмітда забіты ў партызанцы яшчэ вясной. Так цягнулася да канца красавіка 1864 года, калі гэты „Шмідт" сам патрабаваў дыжурнага афіцэра і заявіў апошняму:

— Мяне зваць Оскар Авейдэ, я прадстаўляю падпольны Жонд Польскі, кіраўнік канцылярыі... Я буду адказваць на любыя пытанні следства, але буду называць толькі тых, пра каго сам цвёрда ведаю, што яны альбо загінулі, альбо за мяжой.

Граф М. Мураўёў, каму генерал-губернатар Санкт-Пецярбурга і прыхільнік сталічнай „польскай партыі" князь А. Суворaў-унук яшчэ не прышпіліў навечна мянушку „Вешатель", даручыў „дело Авейдэ" палкоўнікам Сямёнаву і Ратчу, следчым „дела Калиновского", нядаўна скончанага, і даручыў ім наступнае:

— Пусть немец о себе пишет, раз уж так решил. Из других же меня один Калиновский интересует, и пусть не путает, если он такой честный...

Так што ўсё „дело Авейдэ" гэта не звыклыя пратаколы допытаў, а своеасаблівы мемуар, даволі тоўсты сшытак, з якога даведваемся наступнае:

— Оскар Авейдэ, 27 гадоў, народжаны ў Марыямполю, сын урадаўца Эдварда Авейдэ і Паўліны Рутко́ўскай, лютэранін, бацька служыць у Сувалках адвакатам, жыве ва ўласным доме, мае чатырох братоў і сястру Паўліну, 18 гадоў, жыве з бацькамі. Браты: Адам, 30 гадоў, жанаты, служыць у Сувалках у губернскай управе; Артур, 25 гадоў, скончыў фізіка-матэматычны факультэт Санкт-Пецярбургскага універсітэта, у лютым 1863 года пайшоў у паўстанне, служыў у Падлеўскага, загінуў; Эдвард, 22 гады, быў у Галоўнай школе ў Варшаве, загінуў у першыя дні; Яраслаў, 20 гадоў, быў у Галоўнай школе ў Варшаве, служыў у дыктатара паўстання генерала Лянгевіча, загінуў...

М-да, спынімся на хвіліну... Немцы і ў 1863 годзе ёсць немцы. Бацька і старэйшы жанаты брат маюць быць jak niby nic у сваіх Сувалках, пільнаваць дом і 18-гадовую сястру Паўліну, а ўсе маладыя і свабодныя ад абавязкаў ідуць „za wolność naszą, a waszą" і гінуць за Польшчу адзін за адным. Але пачытаем, адкуль сам такі Оскар Авейдэ...

Гімназію скончыў у Сувалках. У 1854 годзе пачаў вучыцца ў Санкт-Пецярбургскім універсітэце, выйшаў у 1858 г. як кандыдат права. Адвакацкую практыку меў у Варшаве. У ліпені 1859 года, па рэкамендацыі „главного попечителя" Санкт-Пецярбургскага універсітэта Дзямянава і на кошт скарбу Каралеўства Польскага, выехаў за мяжу — паўгода Берлін, год Гейдэльберг, паўгода Парыж — галоўным чынам, вывучаў практычнае вядзенне нямецкіх і французскіх судоў для праектаванай у Расійскай Імперыі судовай рэформы.

З-за мяжы вярнуўся 30 кастрычніка 1861 года, два месяцы жыў у Сувалках, потым у Варшаве аплікант у судзе крымінальнай паліцыі, жыў у доме Замойскага, на скрыжаванні Сенатарскай і Жабяй, пад судом і следствам не быў, нерухомасці ці іншай маёмасці не маю...

Ну і чаго цябе, „русского немца", якіх у Імперыі сотні тысяч і якія пануюць (!) над паловай Расіі, панесла ў тую „польскую справу"?! Простая дарога ў Санкт-Пецярбург, на кафедру ці ў міністэрства...

— Мой далейшы чын і ўсе наступныя дзеянні вынікаюць з таго, што Польшча гэта мая Айчына, з майго гарачага жадання вырваць яе з расійскай няволі і зрабіць свабоднай самастойнай дзяржавай, паколькі сэрцам і розумам я адчуваў і адчуваю, разумеў і разумею, што самастойнасць Польшчы ёсць дабро не толькі для Польшчы, але для ўсяе Еўропы разам з Расіяй...

Вось так. Ізноў немец і кандыдат права. Гісторыя так пастанавіла, а што з табой самім будзе, гэта Гісторыю не цікавіць, і цябе не павінна цікавіць. Такіх немцаў у падпольным Жондзе Польскім, было двух — праўнік Оскар Авейдэ загадваў усёй канцылярыяй, а інжынер Браніслаў Шварцэ паставіў тэхнічную частку, у тым ліку сетку сувязі, якую да канца паўстання так толкам і не выкрыла ў Каралеўстве Польскім руская контрразведка. Так атрымалася, што абодва немцы мелі непасрэдныя дачыненні з Каліноўскім. Браніслаў Шварцэ, які легальна будаваў чыгунку Санкт-Пецярбург — Варшава, а нелегальна транспартаваў з-за мяжы напярэдад-

Губернатар Мураўёў...

[I ☞ працяг]

ве паперы ляглі на стол губернатару М. Мураўёву, і будучы граф, пакінуўшы апеляцыю Солтана ўвогуле без увагі, як быццам яе не было (!), на рапарце Нержынскага напісаў дасло́ўна наступнае:

„Абвясціць асобным цыркулярам па ўсёй губерні і ўсім, каго тое датычыцца, што земская дапаможная паліцыя ёсць дзяржаўная ўлада, а соцкія і дзясяцкія ў мястэчках ёсць земская дапаможная паліцыя".

Генерал М. Мураўёў у 1830-1840 гадах быў паслядоўна губернатарам у Гродне, Мінску і Магілёве, як ніхто другі з рускай адміністрацыі ведаў гэты Край і, як ніхто другі, гэты Край ненавідзеў — і не толькі „нашу польскую шляхту", але ўсіх мясцовых абарыгенаў пагалоўна. Кожнай нацыі, веры, сацыяльнага і маёмаснага становішча. Мураўёў глядзеў на палякаў, жыдоў і „тутэйшых", як белы чалавек глядзіць на індыянаў на дзікай прэрыі. Галоўная палітычная ідэя ўсяго доўгага жыцця Мураўёва была руская каланізацыя „Западной России", альбо губерняў Ковенскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Кіеўскай, Валынскай і Падольскай.

„Земская дапаможная паліцыя" ўзору 1831 года была запраектавана як сродак „неафіцыйнага" дзяржаўнага тэрору (!), накіраванага супраць палякаў і жыдоў, якія эканамічна дамінавалі ў „дзевяці заходніх губернях". Быў у Гродзенскага губернатара М. Мураўёва нават намер... зброіць „дапаможную паліцыю" не аднымі дубінамі, а трафейнай зброяй былой польскай арміі і канфіскаванай у панскіх дварах. Спасылаўся губернатар на прыклад Слонімскага павета таго ж 1833 года, калі падбадзёраная вышэйзгаданым цыркулярам „дапаможная паліцыя" самастойна (!) учыніла аблаву, і косамі і дубінамі перабіла і перакалечыла два дзесяткі маладых шляхцюкоў з „атрада Валовіча", які нелегальна перайшоў рускую мяжу на загад д-ра Лелевеля з Парыжа, каб узняць тут нейкае „паўстанне" паводле тэхналогіі „z polską szlachtą polski lud...". На Беларусі мела быць з часам нейкая „колиивщина" 1768 года, вядомая ў польскай гістарыяграфіі як „rzeź humańska".

Так што аканом Шыманскі ў Крынках „отделался лёгким испугом..." А сенатар фон Дзіваў пасля 1832 года ў Крынкі больш не ездзіў! Частку належных яму малых хутароў-„фальваркаў" ён прадаў суседзям, частку... прайграў у карты сваім калегам з Сената і міністэрства замежных спраў, а самі Крынкі даў як пасаг сваёй адзінай дачцэ Марыі фон Дзіваў і выдаў яе замуж за палкоўніка Аляксандра фон Ліпхарта. Сенатарскі зяць быў ужо „больше русский, чем немец", гэта значыць, злодзей, прапойца і нікудышні гаспадар, але меў для Крынак адну незаменную карысную рысу — палкоўнік Аляксандр фон Ліпхарт камандаваў Наваладажскім пяхотным палком... раскватараваным штабам і тылам у Вільні, а „четырьмя дежурными ротами" ў Беластоку. Калі толькі губернатар Мураўёў у 1836 годзе быў пераведзены ў Мінск, усю яго „земскую дапаможную паліцыю" наша „польская шляхта" разагнала наяўным парадкам, а рэвізія Крынак губернскім інспектарам Ферморам ужо ў 1844 годзе паказала, што паншчына завышана больш „інвентара" на 67 дзён у год з аднаго сялянскага двара — о, так гаспадарыў палкоўнік Ліпхарт, маючы напагатове ў Беластоку „четыре дежурные роты"! Так што „залаты мураўёўскі час", калі соцкі Яновіч распараджаў-

ні паўстання тое, што яму даручалі, яшчэ ў 1862 годзе (!) прасіў варшаўскі ЦНК перавесці яго абы-куды з Гродна і Беластока з прычыны рэзкіх разыходжанняў з Каліноўскім: па-першае, Каліноўскі ўпарта адносіў у планах „мяжу Літвы і Беларусі"... далёка на захад ад Беластока, у этнічна польскія паветы, чым падаграваў і без таго гарачыя для падполля спрэчкі „над скурай незабітага рускага мядзведзя", падругое, Каліноўскі самавольна прыўласціў прывезеную Шварцэ друкарню... і пусціў амаль увесь канспіраціўны запас паперы для свае газеты „Mużyckaja Prauda". Такі быў будучы „дыктатар Літвы" летам 1862 года, а Оскар Авейдэ сустрэў Каліноўскага роўна праз год, калі прыехаў у Вільню з паўнамоцтвамі Жонду на своеасаблівую інспекцыю. Справа была не толькі ў тым, што партызанскіх дзеянняў на Літве і Беларусі практычна не было — і ў Каралеўстве Польскім царскія войскі даўно ўзялі ініцыятыву ў свае рукі — але з Вільні ўжо два месяцы (!) не было ніякіх вестак, у тым жа і пра лёс двух даволі значных грашовых авансаў...

— Я запатрабаваў падрабязных тлумачэнняў ад Каліноўскага і Малахоўскага, які быў начальнікам Вільні. Ад іх даведаўся, што становішча вартае слёз і жалю — усё перакручана, пераблытана, у правінцыйнай падпольнай адміністрацыі няма нават паловы патрэбных работнікаў; начальнікаў ваяводстваў не было ніводнага, камісараў большай часткай таксама; партызанскія аддзелы ў паветах амаль паўсюдна выглядаюць жаласна, адным словам, як я зразумеў, у такіх умовах Паўстанне зімы не перажыве, а для таго я палічыў сваім службовым абавязкам аддаць ад імя Жонду катэгарычны загад. Неадкладна пачаць усё спачатку, пакласці падмурак новай падпольнай арганізацыі, разлічанай на доўгі час, а партызанскім аддзелам, у залежнасці ад канкрэтнага становішча, разыйсціся па дамах альбо прабівацца ў цэнтральную Польшчу (пра што ў тыя месяцы падпалкоўнікі Лянгевіч, Траўгут, паручнік Врублеўскі, іншыя палявыя камандзіры ўжо і без загаду стараліся самастойна! — А.Ч.), але Каліноўскі фактычна адмовіўся выканаць гэты загад, бо пачаў горача даводзіць, што ён верыць (!!), што не ўсё яшчэ страчана, і чакае пераломy (!!!) ужо на працягу двух ці трох бліжэйшых тыдняў...

Граф Мураўёў дачытаў да гэтага месца і не ставіў пытанняў пра тое, што было, але зацікавіўся псіхалагічнай характарыстыкай Каліноўскага. Але Оскар Авейдэ быў праўнік, немец і чалавек канкрэтны — і паколькі „чужая душа гэта поцемкі", ізноў вярнуўся да сваіх спамінаў.

Напрыклад, Каліноўскі правёў яго на сваю канспіраціўную кватэру, якая ў жніўні 1863 года была заадно і штаб-кватэрай усяго Літоўскага правінцыйнага камітэта — там усе сталы і шафы былі літаральна заваленыя... падпольнай поштай, якую ніхто нават не разбіраў, тым болей, на яе не адказваў. Складвалася такое ўражанне, што ніякага падполля ў Вільні проста няма... па-за Каліноўскім і Малахоўскім. Сам Каліноўскі на гэтай кватэры не начаваў, а жыў у Вільні на прадмесці ў доме бацькоў свае дзяўчыны Марыі Ямант, з якой таксама пазнаёміў Авейдэ...

Было яшчэ некалькі падобных і, з пункту гледжання Мураўёва, малаістотных спамінаў, і нарэшце граф ясна сфармуляваў, чаго ён хоча ад Авейдэ: адкуль беларускі сепаратызм Каліноўскага, і якія гэты беларускі сепаратызм мае гістарычныя перспектывы для Польшчы?

Оскар Авейдэ ізноў адказаў, як немец, праўнік і чалавек канкрэтны, маўляў, паколькі той „беларускі сепаратыст" Каліноўскі аказаўся нікудышні арганізатар і чалавек неабавязковы, то якая такая розніца — меў гістарычныя перспектывы беларускі сепаратызм альбо не меў, калі тыя „перспектывы" ўжо змарнаваў сам Каліноўскі, „бацька сепаратызму"?

— Эх, не о том ведь тебя спрашивают... — глянуў граф на палкоўнікаў Ратча з Сямёнавым.

Бо Каліноўскі павешаны — і гэта ўжо гісторыя, якую можна... забыць, забараніць, схаваць, а потым перапісаць. Але цяпер толькі 1864 год, і на тым гісторыя не канчаецца, і Бог адзін ведае, якія перспектывы беларускі сепаратызм мае далей, праз пакаленне-другое — для Польшчы... і для ўсяе Імперыі. А гэты сумленны разумны немец ізноў „уклонился"!

За адну падпольную пасаду Авейдэ можна было спакойна павесіць — пад флейты і барабаны. Але павешаны Каліноўскі меў быць апошнім, як „конец мятежа" — у тым і быў палітычны сэнс яго пошукаў і ловаў. Практычнага сэнсу не было, адно жандарскае самалюбства... Цяпер чакала Авейдэ вечная катарга на шахтах за Байкалам, але ж гэты „Людвіг Шмідт" мог так і сядзець, і сябе не раскрываць — гэты сам смерці шукаў, а таму ні катаргі, ні смерці гэтаму немцу не будзе, а будзе яму доля лягчэйшая, але ад смерці горшая.

Мураўёў распарадзіўся адаслаць арыштаванага камісара падпольнага Жонду ў Варшаву — няхай з ім разбіраецца тамашні намеснік, цароў брат і вялікі князь Канстанцін, няхай немец застанецца жыць, ды яшчэ з кляймом, а што з Варшавы Авейдэ выйдзе сухім з вады, Мураўёў быў пэўны, таму што ўжо праектавалася... адмяніць у Польшчы ваеннае становішча — раней, чым на Літве і Беларусі. Забягаючы наперад, разлік графа аказаўся больш, чым слушны. У Варшаве Авейдэ засадзілі пісаць мемуары другі раз, а нават забяспечылі яго матэрыяламі следстваў... і статыстыкай пакаранняў — хто павешаны, хто высланы — маўляў, пішы смела, за сумленне не бойся. А Варшава гэта Варшава, там у палякаў кругом былі свае wtyki — і па польскай сталіцы імгненна разнеслася, што Авейдэ sypie! А каб пацвердзіць такія пэўныя чуткі, рускія ў 1866 годзе выслалі Авейдэ ў падуральскую Вятку, а ў Варшаве... надрукавалі яго запісы — абмежаваным накладам і пад крыптанімам „Для служебного пользования", о так тое робіцца!

Але пакінем пакуль Оскара Авейдэ на дарозе ў Вятку і вернемся да Каліноўскага, бо тут маем хіба самы яскравы прыклад з беларускай гісторыі ў адвечнай парадыгме чалавек і легенда. У той гісторыі Каліноўскага 1862-1864 гадоў усе мелі рацыю — і Шварцэ з Авейдэ, што гэта чалавек неабавязковы, проста лінейны і непапраўны рамантык ды нікудышні палітык і практычны арганізатар, і Мураўёў меў рацыю, што той беларускі фактар праявіцца рана ці позна, і так праявіцца, што ні Расія, ні Польшча не будуць ведаць, што рабіць з беларусамі. Сутнасць палітычнага стрыжня Каліноўскага можна коратка акрэсліць як беларускі эгацэнтрызм — у практычнай палітыцы гэта бяда, але з гістарычнага пункту гледжання і „незаконная", без згоды друкаваная, „Mużyckaja Prauda", бессэнсоўнае чаканне арышту і смерці ў Вільні, калі можна было паспрабаваць шлях уцёкаў, эміграцыі і тых самых мемуараў, з гістарычнага пункту гледжання сэнс у паводзінах Каліноўскага быў — мела паўстаць легенда, таму што памяць пра чалавека кароткая, а легенда вечная, і без легенды... таксама не бывае нацыянальнай ідэі.

Каліноўскі ў жыцці быў беларус роўна столькі, колькі быў літаратар і пакрыўджаны лёсам бядняк, а ў палітыцы гэта быў польскі камуніст.

Каліноўскі ў легендзе гэта прыклад вернасці, нязломнасці, нескаронасці, міласці да Айчыны і яе „беднага простага люду".

Што зробіш, так Гісторыя захацела, бо ўсе нацыі паўстаюць нават на пустым месцы, калі ёсць хоць нейкія легенды і міфы...

Оскар Авейдэ тым часам быў у Вятцы... і больш не вярнуўся ані ў Польшчу, ані выехаў за мяжу. Не скарыстаў ні з амністыі ўжо 1867 года (!), калі трэба было пісаць дзеля вяртання пакаяннае „прошение", ні з поўнай амністыі 1883 года. І не ў тым нават справа, што ніхто не чакаў яго ў Сувалках — там была свая трагедыя, і чакаць не было каму — справа ў тым, што запраектаваны Мураўёвым праект zdrajcy Ojczyzny спраўдзіўся цалкам. Такім Авейдэ трапіў у шмат якія мемуары, знайшліся сотні „сведкаў", дзесяткі „ахвяраў" і „пацярпелых". Лепшай доляй, чым Айчына, была губернская ўправа ў Вятцы, дзе праўнік Оскар Авейдэ мог дапамагаць новым ссыльным.

А выдадзеныя ў 1866 годзе „для служебного пользования" варшаўскія мемуары Авейдэ ў наступных пакаленнях аказаліся каштоўнейшай гістарычнай крыніцай і выкарыстоўваліся дзесяткамі аўтараў.

Але гэта варшаўскія мемуары, а я ў гэтым нарысе перагартаў „віленскі сшытак" Оскара Авейдэ, які сёння знаходзіцца ў Нацыянальным архіве Беларусі ў Гродне.

Алесь Чобат

ся роўна з аканомам Шыманскім, у Крынках успаміналі так доўга, што легенда вырасла...

А Наваладажскі пяхотны полк апошні раз „вызначыўся" ў Крынках у жніўні-верасні 1862 года. Маніфест цара Аляксандра II пра скасаванне паншчыннага ладу ад 19 лютага 1861 года быў дакумент чыста дэкларатыўны. Сялянам было абвешчана, што вырашэнне іх далейшага лёсу і надзяленне зямлёй адкладзена „на два года", а пакуль што абавязаны яны рабіць на пана задарэмна, згодна са старымі „інвентарамі". А паколькі парадкі ў Ліпхарта былі заўжды „свае", а не „інвентарныя", на жніво 1862 года Крынкі ўчынілі страйк і не пайшлі на панскае поле ўвогуле, а супраць „міліцыі" ўжо адстаўнога (!) палкоўніка Ліпхарта ўзброіліся ў традыцыйныя косы і дубіны...

„Но не тут-то было!" Цяперашні камандзір Наваладажскага пяхотнага не мог адмовіць „старому баявому таварышу" і прыслаў з Беластока „11-ю линейную роту" сілай у 125 штыкоў, якая атакавала Крынкі па ўсіх правілах „чачэнскай вайны", адкуль полк нядаўна вярнуўся. Калі з Гродна прыехаў разбірацца штабс-капітан жандараў Лепякоў, які вярнуў у Беласток 11-ю роту, а ў Крынкі паставіў 30 казакоў Данскога казачага палка... для абароны ад „міліцыі" Ліпхарта, то аказалася, як напісаў капітан у рапарце, што „к тому времени Липхарт одиннадцать человек угнал неизвестно куда" — куды, куды, do piachu i już, от куда...

„Крынкаўская вайна" была на паўгода раней (!) Студзеньскага паўстання 1863 года, a propos, трэба быць поўным ігнарантам з Варшавы, каб учыняць паўстанне за тры тыдні да „другога Маніфеста", альбо да 19 лютага 1863 года, калі prosty lud чакаў „зямлю і волю", а потым здзіўляецца, чаму гэта чарговая „земская дапаможная паліцыя", адноўленая Мураўёвым на ўзор 1831 года, ганяе шляхецкую партызанку, як зайцаў — і прыходзіцца паўстанцам заводзіць конных жандараў, і мужыкоў вешаць... A propos, на той горцы Шубаніца ў Крынках „царёвы слугі" вешалі менавіта злапаных конных жандараў.

А сам страшны граф М. Мураўёў — „Вешатель" паяўляецца апошні раз у Крынках незадоўга да свае смерці ў 1868 годзе, ужо выгнаны з Вільні ў адстаўку паводле правіла „негр па чорнай рабоце можа быць вольны" — не сам паяўляецца, ясная справа, але яго цень і дух.

Справа ў тым, што пад канец жыцця ад „ідэі рускай каланізацыі" засталася ў Мураўёва толькі ідэя... забудаваць Гродзеншчыну і Падляшша мураванымі цэрквамі, і яшчэ губернатарам у 1863 годзе граф даў на гэта сто тысяч срэбрам сваіх грошай, альбо 1 млн. рублёў. З разліку па 20 тыс. на храм, гэтага хапала на 50 цэркваў. Быў складзены спісак важнейшых мястэчкаў, у тым жа Гарадок і Крынкі... і пайшла будова — пакуль граф сам быў у Вільні. Так змуравалі царкву ў Гарадку, пад началам палкоўніка Яна Барэйшы... А Крынкі дачакаліся адстаўкі М. Мураўёва, і выдзеленыя на царкву ў Крынках прыватныя грошы графа спачатку „по ошибке" (!) трапілі ў дзяржаўны бюджэт Віленскай губерні, а потым, другі раз „по ошибке" (!), пайшлі на аплату губернскіх пазыкаў у дзяржаўны скарб, у Санкт-Пецярбург. Так не было і няма ў Крынках мураванай „мураўёўкі", а ў Гарадку стаіць — а той „псевдорусский стиль", як сабор у Гродне, будаваўся пазней коштам бюджэту і клічуць яго „мураўёўкамі" з няведання.

Даўным тое было... Але ніхто не забыты і нічога не забыта, таму што ёсць Нацыянальны архіў Беларусі ў Гродне, дзе знойдзена ўсё вышэйзгаданае, і ёсць яшчэ шмат чаго, вядомага і невядомага.

Алесь Чобат

Эх, беларусы, усім вы ўпоперак...

У рэшце рэшт К. Каліноўскі быў разбойнікам ці не? Спадар Мікалай Панфілюк мае сумненні. І не дзіва. Каб некага судзіць, трэба мець бясспрэчны доказ ягонай віны, так як і баронячы некага неабходна быць перакананым, што не памыляемся. Сп. Панфілюк пытаецца: „Цікава ведаць адкуль Петручук зачэрпнуў весткі, што Каліноўскі і яго атрад адрубваў галовы праваслаўным бацюшкам у час паўстання 1863 года?" Гэта не толькі цікава, але і неабходна ведаць, каб не пацярпела праўда. А грамадзянін Петручук, думаю, палічыць за свой доўг даць адказ на пытанне. Сп. Панфілюк піша яшчэ: „Каліноўскі мог выратаваць сваю галаву... толькі трэба яму было пакаяцца...". Варта тут дадаць, што пакаяння і прысягі ўладам было мала. Каліноўскі мусіў яшчэ выдаць усіх удзельнікаў паўстання. Гэтага ён не зрабіў.

Я часценька задумваюся, чаму, калі ў беларускай дзяржаве пачынае кіпяціцца, скажам, у палітычнай абстаноўцы, то і ў Польшчы пра беларусаў і іхную тоеснасць становіцца больш гучна. У пачатку савецкага ладу ў Расіі ўсе чулі, што беларуская гісторыя і культура пачынаюцца з 1917 года, калі кастрычніцкая рэвалюцыя стварыла ўмовы свабоднага развіцця народаў, бо ў дакастрычніцкі перыяд былі быццам толькі буржуйскія памкненні эксплуатацыі працоўнага люду — так у Расіі як і ў „Расіі Літоўскай" (у ВКЛ). Усё ж бальшавіцкім невукам памаленьку трэба было саступіць праўдзе. Але тады ўжо кулакоў і нацдэмаў гналі на Саловушкі з лозунгам: „Железным кулаком мы к счастью общество загоним".

Зрэшты, і раней не мала гаварылася, што беларусы, гэта прыдуманая нацыя. Іхная мова гэта проста гаворка з памежжа Польшчы і Расіі. А калі хто піша на ёй, то толькі часам польскія шляхцюкі для жарту. На жаль, і да сёння многія ў гэта вераць, асабліва людзі, у якіх укаранілася любоў, калі не да польскай, то да рускай „веры". І гэтая любоў дапамагае ўсім зацікаўленым у разладзе, безупынна дзяліць беларусаў, не дапускаць іх да адзінства. Абмежаваныя веды пра сапраўдную гісторыю Беларусі, або яўная ў некаторых выпадках варожасць да яе і прычыняюцца да розных выступленняў, а то супраць беларускіх герояў, а то з перакананнем, што беларусы без дапамогі рускіх ці палякаў няздольныя самі нічога здзейсніць. А можа ў гэтым ёсць нейкая доза праўды? Палякі ж нават у час расійскай акупацыі здабывалі Нобелеўскія прэміі (М. Складоўская ў 1903 і 1911, а Г. Сянкевіч — русский писатель, пишущий на польском языке — у 1905 г.). Праўда, польскай мовы цар не забараняў, толькі за беларускае пісанне ў Сібір гналі.

Калі я нядаўна пачуў па радыё Свабода, што „пачынальнікамі" беларускай літаратуры былі палякі, падумалася, пэўна цяпер палякі хацелі б быць і „паканчальнікамі" ўсяго, што беларускае. Калі ўжо і ў цэрквах бацюшкі пачалі пропаведзі да вернікаў гаварыць па-польску, уявіў я як мужыкі радуюцца — ім ужо ніхто не скажа: Ты, кацап! А як жа абрадуюцца ўладары Белай Русі, што цяпер ніхто з польскага боку не будзе к ім ездзіць, каб падбухторваць да абароны беларушчыны... Вяртаючыся да сапраўдных пачынальнікаў у спамянутых па радыё, Марцінкевічаў ды Багушэвічаў — была гэта апалячаная беларуская шляхта, у сэрцах якой ад многіх пакаленняў захавалася любоў і веды пра мову продкаў. Памятаю, як ставіліся да беларускіх сялян і іхняй мовы асаднікі Пілсудскага, асабліва былыя афіцэры з цэнтральнай Польшчы.

Гледзячы на гатоўнасць бацюшкоў да пераходу з багаслужбай у царкве на польскую мову, міжвольна насоўваецца пытанне: чаму ў беларускім асяроддзі ў Польшчы ці ў Беларусі не ўводзіцца ў царкве беларускай мовы? Праваслаўныя грэкі моляцца па-свойму, а тут не. Некалі гаварылася „польская вера" або „руская вера" хаця гэта нелагічна. Сотні гадоў мінаюць, а мы чуем тое самае. Прывычка гэта ці якая фанатычна-палітычная залежнасць? Многія беларусы адчуваюць сябе вернападданымі Расіі хаця жывуць у Польшчы. В. Петручук з глыбокай любоўю выказвае свае пачуцці пішучы: „Мураўёў у абароне дзяржавы вешаў паўстанцаў... Энцыклапедыя не прыкмеціла хто даражыў Матухнай-Расіяй..." А задачай Мураўёва было замацаванне акупацыі ў Беларусі і якраз царква яму ў гэтым дапамагала. І энцыклапедыя дакладна пра гэта інфармуе. Прычын паўстання ў 1863 г. было шмат, між іншым, жорсткасць пры змушанні уніятаў — нават бізуном — прымаць праваслаўе. Бацюшкі (прысланыя расейцы), ведаючы ваколіцу і сваіх прыхаджан, паспяхова маглі паляваць з войскам на паўстанцаў. Епіскап Сямашка за заслугі ў здушэнні паўстання прадставіў 496 духоўных асоб сваёй епархіі да ўзнагароды медалём. В. Сакоўскі піша, што беларусы павінны абурацца... На каго? На гісторыю, ці тых хто яе не ведае? Праваслаўе прыйшло ў Беларусь з Візантыі. Гэта праўда. Але гэта было 1 000 гадоў таму. Другі раз яно прыйшло з Масквы, пасля падзелу Польшчы. У Расіі ў тым часе здзейсніліся рэформы Нікона, якія былі прычынай „расколу" ў 1659 годзе. 25 студзеня 1721 г. Пётр I скасаваў патрыярхат, а ўвёў „Свяшчэнны сінод". Ад той пары цар быў вартаўніком догмаў і абаронцам прававерасці, усякага парадку. Царква была пераўтворана ва ўрадавы дэпартамент, а рэлігія сталася прыладай царскай палітыкі...

Пасля далучэння Беларусі да Расіі, у 1840 г. забаронена ўжываць назву „Беларусь", а ў цэрквах гаварыць пропаведзі па-беларуску. Маскоўскі патрыярхат быў аднаўлены ў 1917 годзе і Беларусь зноў была яму падпарадкавана. Гэта варта ведаць.

Варта ведаць таксама і пра ўсе іншыя факты трагічнага лёсу Беларусі, якія даставіла ёй „суседства" з Расіяй і Польшчай. Пра ўсё (больш-менш) гэта можна прачытаць у кнізе „Чья Белоруссия" выдадзенай у Маскве.

Цяпер ізноў беларускія ўлады рыхтуюцца ўключыць Беларусь у састаў, ужо капіталістычнай, Расіі. Варта было б ведаць, як там жыве працоўны народ. Які адсотак бяздомных дзяцей жыве на вуліцы — з крадзяжу, вядома, і як сённяшнія капіталісты — былыя камуністы, вядома, — ставяцца да беспрацоўя. Калі Беларусь стане часткай Расіі, саўгасную зямлю беларусаў — якая, скажам, ляжыць цяпер папарам, хутка купяць. Зямля ж гэта скарб, нават калі і лесам зарасце (тады ў лесе слядоў і Курапатаў ніхто не знойдзе). Толькі дзе сяляне падзенуцца? Пасля вайны, пасля савецкай гаспадаркі і ўлады, наўрад ці ў каго захаваліся дакументы на зямлю, якую дзяржава ім забрала. Цудоўную будучыню Лукашэнка ім рыхтуе. Хіба што пастараюцца хутчэй памерці... А можа народ прачнецца? І ўбачыць праўду?

А праўда, што ж, яна тады сабачая, калі яе хлуснёй апраўдваць трэба, хаця хлусня сёння на кожным кроку.

Анатоль Маўчун

N 1.

MUŻYCKAJA PRAUDA.

Dziecinki!

Minuło uże toje. kali zdawało sia usim. szto mużyckaja ruka zdasce tolko da sachi.—ciepier nastau taki czas. szto my sami możem pisaci, i to pisaci takuju prauđu sprawiedliwu jak Boh na niebi. O. zahremić nasza prauda i jak małanka pierelecić pa swieci! Niechaj paznajuć szto my możem nie tolko karmić swaim chlebom. no jeszcze i uczyć swajej mużyckoj praudy.

Pytali i pytajuć usie. szto czuwaci na swieci. chto nam biedym mużykam dać wolność? No prauđu skazauszy mało chto chocze skazaci tak jak sumlenie każe—pa sprawiedliwości. My mużyki. braty waszyje. my wam budziem hawaryć cełuju prauđu. tolko słuchajcie nas!

Maskali. czynouniki i mnoho panou. buduć pierepyniać pismo nasze da was; no najduć sia ludzie i z mużykou razumniejszyje i z panskaho rodu i z miasteczkowych. szto chocżuć waszej swabody. waszaho szczaścia.—jony to wam sami heto pismo dawaci buduć. kab wy znali chto wasz pryjaciel. a chto wasz woroch.

Sześć let uze minuło jak packali hawaryć a swabodzie mużyckoj. Hawaryli. tałkawali i pisali mnoho. a niczoho nie zrabili. A hety manifest szto Car z Senatom i z panami dla nas napisau. to taki durny. szto czort wiedaje da czeho jon padobny.—nijakoj u niom niema prauđy niema z jeho dla nas nijakoj karyści. Parabili Kancelaryi. zrabili sud, jakby heto nie usio rouno brać u sraku czy z sudom, czy bez suda. Parabili Pisarou, Pasrednikou a usio za mużyckije hroszy i wielikije hroszy —czort ich wiedaje na szto; dla toho chyba. kab zapisywali u księzki, jak mnoho napiszuć na srakach mużyckich. A z hetaho to i widać. szto nam niczoho dobraho i nie dumali zrabici.

Prauda. abieszczali to kaliś dać nam wolność: no jak nam zdajeć sia na nasz mużycki rozum, szto chocżuć aszukaci. bo kali prez sześć let niczoho nie zrabili. to czerez rok peunie nie zrobiać. Mohuć jeszcze napisaci i druhi manifest. jeszcze bolszy ad hetaho, no i z hetaho druhobo manifestu niczoho dobraho jak i z pierszaho nie budzie.

Ad maskala i panou nie ma czeho spadziewaci sia; bo jony nie wolności a hłumu i zdzierstwa naszeho chocżuć. No nie douho jony nas buduć ab-